ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарожным дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА ...
За радок нонп. пас...
іншагароднія абвест...
Пасярод тэксту—у ...
Пры шматразовым ...
ка. Звыш тарыфу, згодна ...
СНК ад 10-IX—24 г. біржэвыя 10 проц. ...ваднку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Пролетары всех краёв, злучайцеся!

ЗЬЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 20 кастрычніка 1930 г.
№ 246 (3844)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Москва, Б-ко ВСНХ СССР
Объ. студ. сьпис

Да пленуму ЦК КП(б)Б

Другі пленум ЦК КП(б)Б зьбіраецца пасьля пасьляховага сканчэньня другога году пяцігодкі і ў пачатку ўдарнага кварталу 1930 г.

Другі год пяцігодкі быў пепшай праверкай правільнасьці тэй генэральнай лініі, якую ажыцьцяўляе наша партыя пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту. Пленум зьбіраецца ўпяршыню пасьля XVI зьезду УсеКП(б), які даў партыі на ўвесь бліжэйшы гістарычны пэрыяд праграму разгорнутага сацыялістычнага наступленьня. Другі год пяцігодкі і месяцы, якія прайшлі пасьля XVI зьезду, цалкам і поўнасьцю падцьвярдзілі, што лінія нашай партыі зьяўляецца правільнай. Яны паказалі, што пад правільным бальшавіцкім кіраўніцтвам нашай партыі ўзьнялася новая магутная хваля энтузіязму мільённых пралетарскіх мас і працоўнага сялянства весні.

Наш пераможны рух наперад разьвіваўся ў абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы, у абстаноўцы барацьбы супроць агентаў клясавага ворага ўнутры нашай партыі — правых апартуністых. Увесь мінулы пэрыяд яшчэ і яшчэ раз паказаў, што правыя апартуністыя зьяўляюцца кулацкай агентурай і што толькі ў барацьбе супроць іх партыя магла ажыцьцяўляць правільную палітычную лінію.

Перамагаючы вялізарныя труднасьці, трудкасьці росту, КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК падаедзіць да пленуму вынікі буйных дасягненьняў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. За другі год пяцігодкі валавая прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці ўзрасла на 69 проц., капітальнае будаўніцтва прамысловасьці выканана на суму 44 млн. руб., колькасьць рабочых узрасла на 14.073 чал. Плошча пад калгасамі і саўгасамі ўзрасла да 20 проц. У выніку правільнай палітыкі партыі ўзьнімаецца новая хваля калгаснага прыліву. Пад кіраўніцтвам партыі вырашана цалкам праблема беспрацоўя і замест гэтай праблемы паўстала новая — праблема больш шырокай арганізацыі працы і ўцягненьня новых пластоў працоўнага насельніцтва ў вытворчасьць. Бязумоўныя посьпехі ёсьць і на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Сацыялізм расьце ў бязьлітасным змаганьні з кандрацьеўска-громанаўскай контр-рэвалюцыяй, са шкодніцтвам, з усімі капіталістычнымі элемэнтамі гораду і вёскі. Мы рухаемся наперад наперакор сусьветнай буржуазіі, якая ўсё больш антыўна шукае выхаду са свайго крызісу — у новых войнах і, перш за ўсё, у падрыхтоўцы вайны супроць Савецкага Саюзу.

Пад знакам бальшавіцкіх рашэньняў XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б) — наша беларуская арганізацыя — непарыўная частка УсеКП(б) ідзе на чале сацыялістычнага будаўніцтва, і з усёй ленінскай непрымірымасьцю б'е па правых апартуністых, па «левых» загібшчынах, па нацыянал-апартуністых усіх колераў.

Побач з гэтым асноўным і рашаючым — вялікімі посьпехамі другога году пяцігодкі, мы маем і паасобныя прарывы. Асноўнымі з іх зьяўляюцца: невыкананьне такіх важнейшых якасных паказальнікаў у рабоце прамысловасьці, як зьніжэньне сабекошту і паляпшэньне якасьці прадукцыі, слаба яшчэ мабілізуюцца грашовыя рэсурсы насельніцтва, загатоўкі ў радзе месц не набылі яшчэ патрэбных, бальшавіцкіх тэмпаў. Паасобныя партыйныя арганізацыі яшчэ ня сталі на чале новага прыліву ў калгасы.

Клясавы вораг шматлікі. Кулак у вёсцы, нэпман у горадзе, нявыкрыты шкоднік у нашым апараце, даўрушнік унутры партыі, — усе яны, кожны ў сваім абсягу, вядуць змаганьне супроць генэральнай лініі нашай партыі, усе яны імкнуцца сарваць сацыяльную калектывізацыю і ліквідацыю кулацтва на гэтай аснове.

Важнейшай прычынай паасобных прарываў зьяўляецца зусім невыстарчальная ў некаторых мясцох барацьба супроць клясавага ворага, невыстарчальнае змаганьне з правай і «левай» апартуністычнай практыкай. Выконваць задачы ўдарнага кварталу мы будзем у абстаноўцы нарастаючай клясавай барацьбы. Далейшая калектывізацыя бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, палітыка сацыяльнай калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай аснове кулацтва, як клясы, далейшае арабочаньне дзяржаўнага апарату, ачыстка яго ад чужакоў, барацьба за культурную рэвалюцыю, за сацыялістычныя формы працы, — усе гэтыя задачы будуць вырашацца ў бязьлітаснай барацьбе з клясавым ворагам. Узмацніць клясавую пільнасьць, умацоўваць бальшавіцкае, пралетарскае кіраўніцтва на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва — зьяўляецца карэннай задачай усіх нашых партыйных арганізацый.

Далейшае паскараньне тэмпаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва на ўсіх яго вучастках зьяўляецца асноўнай задачай усіх нашых арганізацый, усяе рабочае клясы, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас. Гэта важнейшая ўмова хутчэйшай ліквідацыі нашых затрудненьняў. Трэба накіраваць агонь супроць тых, хто хоча цягнуць партыю назад, хто стаміўся ад нашых тэмпаў, хто перашкаджае выканаць генэральную задачу разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце. Не раўнаньне на вузкія месцы, а канцэнтрацыя сіл для іх хутчэйшага перамаганьня!

Выкананьне пляну капітальнага будаўніцтва, выкананьне якасных і колькасных паказальнікаў прамысловасьці, поўнае пасьпяховае правядзеньне пляну заготовак, мабілізацыя сродкаў, лесазагатоўкі, упартая работа па далейшай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак — вось асноўныя задачы ўдарнага кварталу.

Ад пасьпяховага іх вырашэньня залежаць тэмпы выкананьня пяцігодкі за чатыры гады і плян трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Мы павінны давесьці гэтыя задачы да сьвядомасьці кожнага рабочага, кожнага калгасьніка, бедняка і серадняка, дабіцца актыўнага ўдзелу мас у барацьбе за выкананьне гэтых задач.

Акругі ліквідаваны. Асноўная частка акруговага актыву паслана ў раёны. Скончыўся першы этап умацаваньня раёнаў, як вузлавога пункту сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы.

Аднак, работа ў раёнах і ў цэнтральных органах яшчэ не перабудавана. Цэнтральныя установы дрэнна зьвязаны з месцамі, месцы дрэнна зьвязаны з цэнтральнымі арганізацыямі.

Пленуму прадстаіць дэталёва абмеркаваць становішча на мясцох і вызначыць асноўныя мерапрыемствы ў абсягу умацаваньня раёнаў.

Асноўным шляхам сапраўднага ўмацаваньня раёнаў зьяўляецца шлях карэннай перабудовы ўсяе работы ў раёнах. Да гэтага часу ёсьць недавацэнка значэньня перабудовы работы ў раёнах, многія раёны пайшлі па лініі найменшага супраціўленьня і зводзяць усё пытаньне аб умацаваньні раёнаў і работы ў раёнах да пасылкі заявак на кадры ў Менск.

Асноўнымі задачамі раёну ў абсягу перабудовы сваёй работы зьяўляецца забесьпячэньне актыўнага ўдзелу мас ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве, сапраўдная мабілізацыя пралетарскіх калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вакол нашых асноўных задач у вёсцы.

Палітычна-гаспадарчыя і вытворчыя задачы раёну павінны стаць у асяродку ўвагі раённых арганізацый. Вядучыя галіны сельскае гаспадаркі (жывёлагадоўля, ільнаводзтва) павінны стаць важным зьвяном у іх рабоце. Трэба пастаіць рашуча пытаньне аб бязумоўнай перадачы раёнам усіх правоў акруг.

Патрэбна карэнная перабудова работы і цэнтральных арганізацый. Рашучы паварот цэнтральных арганізацый тварам да раёну, канкрэтнае вывучэньне раёну, канкрэтнае кіраўніцтва ім, жывая, дзелавая, а не гастралёрская сувязь, — зьяўляецца неабходнай прадпасылкай перабудовы работ цэнтральных арганізацый.

Трэба зрабіць карэнны пералом і ў галіне падрыхтоўкі кадраў для раёнаў. Перад раёнамі стаіць задача масавага вылучэньня новых кадраў з рабочых, батракоў, беднякоў, калгасьнікаў. Перабудова работы ў раёнах мяркуе перабудову і разгортваньне работы ўсіх прыводных пасаў ад партыі да мас, як-та: камсамолу, прафсаюзаў, каапэрацыі, добраахвотных арганізацый. Узмацненьне вясковай партарганізацыі павінна ўвесь час стаяць у асяродку ўвагі ўсіх арганізацый КП(б)Б.

Важнейшае палітычнае значэньне мае пастаноўка на пленуме нацыянальнага пытаньня. Наша КП(б)Б мае вялізарнейшыя дасягненьні ў галіне вырашэньня нацыянальнага пытаньня. Трэба паставіць пад агонь бязьлітаснай бальшавіцкай самакрытыкі ўсе тыя прарывы і недахопы, якія ў нас ёсьць у практычным ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі.

Вырашэньне нацыянальнага пытаньня, як і ўсё сацыялістычнае будаўніцтва, адбываецца ў абстаноўцы абвостранага клясавага змаганьня. Задачы ў галіне нацыянальнай палітыкі мы будзем з посьпехам вырашаць пры ўмове яшчэ большага ўзмацненьня наступленьня на клясава-варожыя сілы, што выступаюць у форме вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, беларускага нацыянал-дэмакратызму і іншых відаў нацыяналізмаў. Правільнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня магчыма толькі ў бязьлітаснай барацьбе супроць усякіх нацыяналістычных ухілаў у нашай партыі, у першую чаргу, супроць расійскага вялікадзяржаўнага ўхілу, які зьяўляецца ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ. Тое, што вялікадзяржаўны расійскі шавінізм зьяўляецца галоўнай небясьпекай, ні ў якім выпадку не азначае амністыі і паспабленьня барацьбы супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму і іншых шавінізмаў. У сувязі з актывізацыяй унутры нашай партыі ўхілаў у бок нацыяналізму, трэба з усёй выразнасьцю падкрэсьліць несумяшчальнасьць прапаганды нацыянал-апартуністычных поглядаў з прабываньнем у радах нашае партыі. Пленум дасьць выразныя дырэктывы аб далейшым разгортваньні беларусізацыі, падрыхтоўцы і вылучэньні карэнных кадраў і аб паляпшэньні абслугоўваньня нацменшасьцяй Беларусі.

Усе задачы, як у галіне гаспадарчага будаўніцтва, так і ў галіне нацыянальнай палітыкі, умацаваньня раёнаў, можна будзе з посьпехам вырашыць толькі пры тэй умове, калі мы яшчэ больш узмоцнім барацьбу з усімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі. Правая небясьпека зьяўляецца асноўнай небясьпекай. Агонь барацьбы супроць правых і «левых»—апартуністычных скрыўленьняў лініі партыі, павінен быць яшчэ больш узмоцнены.

КП(б)Б дасьць рашучы адпор новым манэўрам апартуністых, якія заключаюцца ў прыспанньні на словах генэральнай лініі партыі і фактычнай барацьбе супроць яе. Двурушнікам і здрадніканм партыі, тыпу Руціна, ня месца ў бальшавіцкіх радах. Яшчэ больш павінна быць завострана барацьба супроць прымірэнцкіх адносін да ўхілаў ад лініі партыі.

На аснове самакрытыкі, пленум ЦК КП(б)Б па-бальшавіцку вырашыць усе задачы, якія пераад ім стаяць.

V зьезд кампартыі Польшчы

Рэзалюцыя па пытаньні аб рабоце ЦК КПП

V зьезд КПП цалкам ухваляе палітычную лінію і работу абноўленага партыйнага кіраўніцтва. Асабліва зьезд падкрэсьлівае поўную правільнасьць лініі Цэнтральнага Камітэту ў справе кансалідацыі партыі, якая праводзіцца ў непрымірымай барацьбе на два франты—з правым ухілам і апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, і ўсякімі ультра-левымі памылкамі і праяўленьнямі сэктанцтва. Зьезд ухваляе ідэалёгічную работу Цэнтральнага Камітэту, якая ўзброіла партыю супроць нацыску варожай ідэалёгіі і ілюзій, што пашыраюцца сацыял-фашызмам.

Зьезд падкрэсьлівае вялізарнае значэньне рэзалюцый VI і VII пленумаў у справе разьвіцьця нашае партыі. Калі VI пленум зрабіў пералом на шляху згуртаванасьці партыі, дык VII пленум даў пачатак павароту ў практыцы партыі, павароту, ажыцьцяўленьне якога будзе вырашаць аб кіруючай ролі партыі ў рэвалюцыйным руху.

Падкрэсьліваючы вялізарнае значэньне далейшай работы па ўзьняцьці ідэалёгічнага ўзроўню партыі, зьезд прапануе Цэнтральнаму Камітэту працягваць пачатую дыскусію па праграмных пытаньнях. Зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту падрыхтаваць праект праграмы партыі і разгарнуць вакол яго шырокую дыскусію ўнутры арганізацыі і ў друку.

Зьезд канстатуе сур'ёзныя посьпехі партыі за час з IV зьезду КПП. Да іх трэба аднесьці ў першую чаргу буйную масавую выбарчую кампанію ў сойм 1928 г., гэрэчную ўсеагульную забастоўку подзінскіх тэкстыльшчыкаў, масавыя забастоўкі сельска-гаспадарчых рабочых 1928 і 1929 г. г. у Заходняй Украіне, кампанію 1 жніўня ў 1929 годзе, сакавіковую кампанію і першамайскую кампанію 1930 г., масавую кампанію ў сувязі з Міжнародным Сялянскім кангрэсам, кампанію ў часе выбараў у Верхнясілескі сойм, посьпехі рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага блёку ў часе паўторных выбараў у сойм у Лідзкай акрузе і на Валыні, асабліва ў Ковельшчыне, нарэшце, масавую кампанію ў сувязі з V кангрэсам Прафінтэрну.

Аднак, агульны рост актыўнасьці партыі, асабліва ў штодзённай барацьбе рабочае клясы і эксплёатаванага сялянства, не пасьпявае за шпаркім тэмпам разьвіцьця рэвалюцыйнага руху. Пашырэньне арганізацыйнае сеткі партыі і яе прызнаных пасаў да мас адстае ад вялізнага росту ўплыву партыі. Зьезд зварачае ўвагу партыі на пагражаючы разрыў паміж уплывам партыі і арганізацыйным ахопам. Гэты разрыў з асаблівай вастратой выступае ў даны пэрыяд шпаркага насьпяваньня элемэнтаў рэвалюцыйнай сытуацыі ў Польшчы. Зьезд падкрэсьлівае, што ўсе намаганьні партыі павінны быць накіраваны на ліквідацыю гэтага разрыву, на ўзмацненьне апоры партыі на буйных заводах і капальнях, на чыгунках, сярод сельска-гаспадарчых рабочых і сялянскае беднаты, на завяваньне большасьці рабочае клясы і ўмацаваньне гэгамоніі пралетарыяту ў рэвалюцыйным сялянскім і нацыянальна-вызваленчым руху.

Зьезд паказвае на неабходнасьць узмацніць кіраўніцтва партыі ў штодзённай барацьбе рабочае клясы і эксплёатаванага сялянства. Пашыраючы гэтыя баі і надаючы ім палітычны характар, партыя будзе набліжаць масы да непасрэднага змаганьня за ўладу саветаў, за рабоча-сялянскі ўрад, за дыктатуру пралетарыяту. Зьезд паказвае на неабходнасьць цясьнейшай сувязі Цэнтральнага Камітэту з акругамі, сыстэматычнага інструктаваньня акруг і сталага кантролю над іх работай; больш цеснай увязкі паасобных галін работы, узмацненьня кіруючай ролі ЦК КПП у адносінах да КПЗУ і КПЗБ, а таксама Камуністычнага Саюзу Моладзі. Зьезд падкрэсьлівае таксама неабходнасьць шчыльнай увязкі работы партыі з Выканкомам Камінтэрну і брацкімі партыямі Савецкага Саюзу, Нямеччыны, Чэха-Славакіі і Прыбальтыцкіх краін.

Падкрэсьліваючы, што неабходнай умовай баяздольнасьці партыі зьяўляецца яе ідэалёгічная і арганізацыйная згуртаванасьць, зьезд абавязвае новы Цэнтральны Камітэт весьці далейшае паглыбленьне барацьбы з правым ухілам, з апартуністычнымі канцэпцыямі т. т. Варскага, Костшэвы, Лапінскага, Стэфанскага і Бранда.

Зьезд лічыць заяву збанкрутаванай правай апазыцыі ў ЦК—т. т. Прухняка, Стэфанскага, Краеўскага і В., паданую пад націскам зьезду, невыстарчальнай, Гэта заява, паданая на наступны дзень пасьля нападак на лінію партыі непасрэдна перад зьездам і ў часе самога зьезду, не дае гарантыі таго, што гэтыя таварышы сапраўды перайшлі на лінію партыі. Толькі іх актыўная барацьба з правымі канцэпцыямі, толькі карэнная рэвізія і самакрытыка ўласных памылак, пасьлядоўнае выяўленьне крыніц памылак, разрыў усіх нітак, што зьвязваюць іх з правадырамі правай групы (а т. т. Варскім, Костшэвай і Лапінскім), сапраўдная ліквідацыя ўласнае групы, таксама як і манэўраваньняў перад партыяй, будзе довадам пераходу гэтых таварышоў на лінію партыі і поўнага іх разбраеньня ў адносінах да партыі.

Зьезд асуджае спробы ачарніць партыю і яе кіраўніцтва ў дакладной запісцы, накіраванай тав. Варскім за сьпіной ЦК у Выканком Камінтэрну, і прапануе коваму ЦК зрабіць адпаведныя вывады ў адносінах да тав. Варскага. Зьезд канстатуе, што тав. Варскі ўхіліўся ад абароны сваіх поглядаў на зьезьдзе.

Зьезд канстатуе, што антыпартыйная пазыцыя тав. Барташэвіча нясумяшчальна з прыналежнасьцю да КПП, таксама як і да іншай сэкцыі Камінтэрну.

Заклікаючы ўсю партыю да далейшай непрымірымай барацьбы з правымі і «левымі» ўхіламі, з апартунізмам на практыцы, таксама з усякімі праяўленьнямі прымірэнцтва, зьезд папярэджвае, што ўсякая спроба падрыву адзінства і дасягнутай згуртаванасьці партыі, парушэньня бальшавіцкай партдысцыпліны, спаткае самую вострую процідзейнасьць з боку партыйнага кіраўніцтва і ўсяе партыі. Усякая спроба аднавіць фракцыйную барацьбу паставіць кожнага фракцыянэра па-за партыйнымі радамі.

Умацоўваючы бальшавіцкую маналіт-насьць сваіх радоў і кіраўніцтва, партыя выканае вялізарнейшыя задачы, ускладзеныя на яе нарастаньнем рэвалюцыйнай сытуацыі ў Польшчы і пагрозай вайны супроць СССР.

У фашысцкай Польшчы

Асьвета--толькі не для працоўных

У адным з апошніх нумароў «Зьвязды» мы пісалі ўжо, што ў фашысцкай Польшчы ў бягучым навучальным годзе наумільёна дзяцей застаецца па-за сьценамі школы. Чые дзеці застаюцца зусім няпісьменнымі — ня прыходзіцца гаварыць. Зразумела, што працоўная беднота гарадоў і сёл, якая церпіць голад і холад, — застаецца і няпісьменнаю.

Не зайздросны лёс і тых дзяцей, якім і ўдаецца трапіць у пачатковую школу. Як падае нават буржуазная прэса, у школах, з прычыны недахвату настаўнікаў, дзеці вучацца толькі па 2 гадзіны ў дзень. Трэба адзначыць, што буржуазны друк падае зьвесткі пераважна пра становішча школ гарадзкіх. Калі-ж такое ганебнае становішча назіраецца ў гарадзкіх пачатковых школах, дык пра сельскія няма чаго гаварыць.

Але вось дзіцё рабочага або селяніна скончыла пачатковую школу. Ці мае яно магчымасьць атрымаць далейшую асьвету? Ці мае магчымасьць вучыцца і скончыць хаця-б сярэднюю школу, не гаворачы ўжо аб вышэйшай?

Як падае «Газэта Варшавска», у Польшчы ў 1927-28 г. было 794 сярэдніх школ, з іх 270—урадавых, атрэшта — 524 — прыватныя. Прыватныя школы, за выключэньнем інструкцый і мэтадычных указаньняў, ад ураду ніякае матар'яльнае дапамогі не атрымліваюць. Яны ісьцюць за кошт вучнёўскай платы за навучаньне. Паводле буржуазна-польскай прэсы, у Варшаве гэта аплата складае 90-100 злотых на месяц за вучня, а на правінцыі — да 200 злотых. Адзіным клопатам міністэрства ў адносінах да прыватных сярэдніх школ — гэта клопаты аб палітычнай «благонадзежности» настаўніцтва. Нават буржуазная прэса адзначае, што ў гэтых адносінах, а таксама і адносінах матар'яльнага становішча, сярэдняе польскае школьніцтва перажывае зараз горшыя часы, чым гэта было пры царызьме.

Як мы ўжо сказалі, за навучаньне ў правінцыяльнай сярэдняй школе трэба плаціць 200 злотых у м-ц. Ці-ж можа рабочы або бядняк-селянін і нават серадняк кучыць свае дзіцяці ў сярэдняй школе? Дзе-ж узяць такія грошы? Калі нават добра кваліфікаваны рабочы зарабляе ў месяц ня больш 120 злотых?

Зараз па загаду міністра народнае асьветы — Чэрвінскага, за карыстаньне інструкцыямі і мэтадычнымі ўказаньнямі міністэрства кожная прыватная сярэдняя школа павінна плаціць 300 злотых у месяц. Такім чынам, школьная плата за кожнага вучня зноў павялічваецца на некалькі дзесяткаў злотых у месяц. Пры такіх умовах сярэдняя школа для рабочага, або селяніна ў фашысцкай Польшчы зьяўляецца зусім недаступнай.

Аварыя францускага самалёту на тэрыторыі СССР

МАСКВА, 18. Начальнік паветраных сіл РСЧА атрымаў з Быхава (120 кілёмэтраў на поўдзень ад Воршы) паведамленьне, што ў 3-х кілёмэтрах на поўнач ад Старога Быхава сёньня пацярпеў аварыю французкі самалёт з францускім лётнікам. Паводле заявы лётніка, аварыя здарылася ў выніку спыненьня падачы масла. Масьляная помпа матору пад моцным атмасфэрным націскам спыніла работу. Самалёт упаў і разьбіўся. Лётнік не атрымаў ніякіх параненьняў.

МАСКВА. Паводле атрыманых ТАСС'ам дадатковых вестак пацярпеўшы каля Быхава аварыю французкі лётнік, ня меў дазволу ад савецкіх улад на палёт над савецкай тэрыторыяй. Лётнік затрыманы і будзе дастаўлены ў Маскву для далейшага сьледзтва.

НОВЫЯ НАЗНАЧЭНЬНІ

МАСКВА, 18. Загадам па ВСНГ СССР старшыня праўленьня аб'яднаньня «Всехимпром» тав. ГОЛЬЦМАН аслабанялецца ад гэтай пасады.

Тав. ПЯТАКОЎ назначаецца старшынёю праўленьня аб'яднаньня «Всехимпром».

Прэзыдыум ЦВК СССР назначыў тав. КАЛМАНОВІЧА МАІСЕЯ ЯЗЭПАВІЧА старшынёю праўленьня дзяржаўнага банку Саюзу ССР, аслабаніўшы ад гэтага абавязку тав. ПЯТАКОВА.

МАСКВА, 18. Прэзыдыум цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР пастанавіў аслабаніць тав. БРУХАНАВА МІКАЛАЯ ПАЎЛАВІЧА, згодна яго просьбы, ад абавязкаў народнага камісару фінансаў Саюзу ССР.

МАСКВА, 18. Прэзыдыум ЦВК СССР назначыў тав. ГРЫНЬКО РЫГОРА ФЁДАРАВІЧА народным камісарам фінансаў Саюзу ССР, аслабаніўшы яго ад абавязкаў намесьніка народнага камісара земляробства Саюзу ССР.

ЗАБАСТАВАЛІ 120.000 БЭРЛІНСКІХ МЭТАЛІСТЫХ

Кіраўнікі забастоўкі прыйшлі ў стачачны камітэт за інструкцыямі

Сацыял-фашыстыя падтрымліваюць урад 48 параграфу

Дзень найвялікшага здрадніцтва сац.-фашыстых

Бурнае пасяджэньне рэйхстагу

БЭРЛІН, 19. На чарговым пасяджэньні рэйхстагу 18 кастрычніка ўрад Брунінга поўнасьцю правёў сваю праграму. Вотумы недавер'я ўраду ня былі нават пастаўлены на галасаваньне. Пытаньне аб апошніх законах, выданых урадам Брунінга ў парадку інтарэсаў параграфу, а таксама прапанова камфракцыі аб спыненьні плацяжоў па пляну Юнга, пахаваны ў камісіі. Пры актыўнейшым удзеле сацыял-дэмакратаў. Прапанова камуністых аб адмене забароны дзейнасьці саюзу чырвоных франтавікоў і іншых пралетарскіх арганізацый адхілена галасамі ўсіх партый. Галасамі сацыял-дэмакратаў таксама сарвана прапанова камфракцыі аб выдачы аднаразовай дапамогі беспрацоўным з прычыны надыходу зімы; гэта прапанова перадана ў камісію. Пры чынным падтрыманьні сацыял-дэмакратаў адхілена прапанова камуністых і аб анулываньні трацейскага рашэньня па пытаньні аб зарплаце берлінскіх мэталістых. Ухвалена галасамі сацыял-дэмакратаў, камуністых і нацыянал-сацыялістых (фашыстых) вядомая ўжо прапанова сацыял-дэмакратаў, якая патрабуе ад ураду недапускаць абвяшчэньня рашэньня арбітра абавязковым. На пасяджэньні рэйхстагу з прамовамі выступалі рад камуністычных прамоўцаў.

Пасяджэньне рэйхстагу мела нельмі бурны характар. Сацыял-дэмакраты адкрыта падтрымлівалі ўрад брунінгаўскай дыктатуры Брунінга. Камуністычныя дэпутаты пратэставалі супроць адкрытага здрадніцтва сацыял-дэмакратамі іх уласных перадвыбарчых лёзунгаў.

Камуністыя пачалі пяяньне «Інтэрнацыяналу». Рэйхстаг прымушаны быў да канца выслухаць баявы рэвалюцыйны гімн. У канцы пасяджэньня старшыня рэйхстагу выключыў камуністычнага дэпутата тав. Хлорына на тры пасяджэньні.

«Ротэ Фанэ» заяўляе, што сваім учарайшым галасаваньнем за ўрад Брунінга сацыял-дэмакратыя перавысіла ўсе свае ганебныя дзеяньні, усе факты сваёй здрадніцкай работы за апошнія гады. «Учарайшы дзень—зазначае «Ротэ Фанэ»—зьяўляецца днём самага буйнога здрадніцтва, якое ўчынена сацыял-дэмакратамі ад часу 4-га жніўня 1914 г., калі яны галасавалі за прадастаўленьне ваенных крэдытаў».

Буржуазны праект амністыі

БЭРЛІН, 19. На начным пасяджэньні рэйхстагу абмяркоўвалася пытаньне аб амністыі. Ухвалена прапанова правых партый, якая прадугледжвае амністыю па справах палітычных злачынстваў, зробленых да 1-га верасьня 1924 году. Піа ад імя камфракцыі заявіў, што ўнесены праект амністыі зьяўляецца нездавальняючым, але з прычыны немагчымасьці дабіцца поўнай амністыі для ўсіх палітычных пралетарскіх зьняволеных, камуністыя ўсё-такі будуць галасаваць за яго, каб вызваліць хаця-б невялікую колькасьць пралетарскіх байцоў. Прапанова камуністых—пашырыць амністыю на ўсе палітычныя злачынствы, зробленыя да 1-га кастрычніка 1930 году—адхілена.

Ухвалены закон аб амністыі пашыраецца і на частку пралетарскіх палітычных зьняволеных, сярод якіх знаходзяцца вядомыя пралетарскія барацьбіты, якія на працягу доўгіх год пакутуюць у катаржных турмах. Амністыя распаўсюджваецца і на фашыстых, якія выступалі ў ролі тайных забойцаў.

Стварайце камітэты салідарнасьці, стварайце чырвоныя атрады самаабароны

Згуртаванымі радамі разьбейце агульнага ворага

З адозвы цэнтральнага забастовачнага камітэту

БЭРЛІН, 18. «Ротэ Фанэ» (орган кампартыі) публікуе адозву цэнтральнага забастовачнага камітэту рэвалюцыйнай прафапазыцыі да бастуючых берлінскіх мэталістых і ўсіх працоўных Берліну. У адозве гаворыцца:

«5 дзён таму назад вы пачалі вашу магутную забастоўку. Сёньня вечарам правадыры сацыял-дэмакратычнай партыі пашлі на правал інтарэсаў рабочых для выратаваньня варожага рабочым дыктатарскага ўраду Брунінга. Рабочыя-мэталістыя ня далі сябе ўвесьці ў абман наглым ашуканцам, якія абяцаюць зьнізіць цэны. Іменна гэтым прыёмам былі ў свой час ашуканы рабочыя мэтапяпрамысловасьці Паўночна-Заходняга раёну, гэрэчная барацьба якіх была сарвана сацыял-дэмакратамі.

Рабочыя-мэталістыя, вы не павінны далей цярпець, каб рабочыя на прадпрыемствах, якія не ўваходзяць у саюз прадпрыемцаў берлінскай мэтапюргіі, выкарыстоўвалі ў якасьці штрэйкбрахэраў. На прадпрыемстах і ў прафэсыянальных арганізацыях арганізуйце зборы ў карысьць армії забастоўшчыкаў, якая змагаецца. Стварайце камітэты салідарнасьці на аснове пралетарскага адзінага фронту. Памятуйце, што пашырэньне забастоўкі на іншыя буйныя галіны прамысловасьці прыведзе да перамогі забастоўкі на працягу-жа бліжэйшых дзён. Вы—сіла, супроць якой прадпрыемцы бездапаможны. Вам забясьпечана падтрыманьне чырвонага Берліну, усіх працоўных Нямеччыны. Прыпамжце ўсе намаганьні, каб забясьпечыць забастоўцы рэвалюцыйнае кіраўніцтва. Арганізуйце на сваіх прадпрыемствах моцныя ячэйкі, уступаючы масамі ў рэвалюцыйную прафапазыцыю. Стварайце на кожным прадпрыемстве чырвоныя атрады самаабароны. Разьбейце пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнай прафапазыцыі здрадніцкія пляны рэфармістых. Дамагайцеся поўнага задаваленьня вашых патрабаваньняў шляхам абвастрэньня і пашырэньня забастоўкі.

Працоўныя Берліна! Перамога мэталістых—ваша перамога. Згуртаванымі радамі разьбейце агульнага ворага!

Новыя стаўкі дыфэрэнцыяванага паю

МАСКВА. Праўленьне Цэнтрасаюзу ўстанавіла новыя стаўкі дыфэрэнцыяванага паю на асобны квартал і на 1931 год.

Для беспрацоўных і асоб, якія атрымліваюць пэнсіі — пай захаваны ў ранейшых разьмерах (5 руб.). Рабочыя і служачыя з заработкам да 50 руб. плацяць 19 руб., да 100 руб. — 30 руб., да 150 руб. — 40 руб., да 200 руб. — 65 р., да 250 руб. — 76 руб. і да 300 руб. — 95 руб. Для рабочых і служачых, якія атрымліваюць заработную плату звыш 300 руб., устаноўлены пай у разьмеры 115 р. Утрыманцы—члены сем'яў рабочых і служачых уносяць чацьвёртую частку асноўнага паю галавы сям'і.

Таксама аменены дыфэрэнцыяваны пай для сялян-адзіначасобнікаў. Асобы, вызваленыя ад уплаты сельска-гаспадарчага падатку, уносяць пай у разьмеры 16 руб., сяляне-ж, ападаткаваныя с.-г. падаткам, з прыбыткам да 250 р., уносяць 32 руб., з прыбыткам да 350 руб. — 40 руб., да 500 руб. — 60 руб., да 700 руб. — 85 руб., да 1.000 руб. — 125 руб.

Сяляне-адзіначасобнікі, якія маюць прыбытак ад гаспадарак звыш 1.000 р., уносяць 155 руб. Сяляне, не пазбаўленыя выбарчых правоў, ападаткаваныя сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку з прыбытковасьцю гаспадаркі да 700 руб. плацяць ня менш 120 руб. Такія-ж гаспадаркі з прыбытковасьцю звыш 700 руб. плацяць ад 125 да 150 руб. Утрыманцы ўносяць чацьвертую частку паю галавы сям'і.

Для членаў камун дыфэрэнцыяваны пай у спажывецкую каапэрацыю ўстаноўлены ў разьмеры 13 руб. Новы пай уводзіцца, пачынаючы з другога кварталу. Праўленьне Цэнтрасаюзу запрапанавала ўсёй спажывецкай сыстэме неадкладна разгарнуць работу па зборы паёў, дабіваючыся поўнага выкананьня пляну паянакапленьня ў асобным квартале.

Пленум ЦК КП(б)Б

адкрываецца

СЁНЬНЯ а 6 гадз. увечары, у Доме Камасьветы імя Карла Маркса (вул. К. Маркса).

ДОСЫЦЬ НАПАМІНАНЬНЯЎ

Прайшло ўжо амаль два месяцы з таго часу, калі пытаньне мабілізацыі сродкаў партыяй і ўрадам было пастаўлена ў рад баявых пытаньняў бягучага часу. Час выстарчальны для таго, каб правесьці належныя арганізацыйныя мерапрыемствы, каб пераўдавацць работу ў адпаведнасьці з пастаўленай баявой задачай і нагнаць упушчанае. Рабочыя шмат якіх фабрык і заводаў, дзе былі прарывы ў выкананьні прамфінпляну, у адказ на верасьнёўскую адозву ЦК УсеКП(б), шляхам сацыялістычных мэтадаў барацьбы за плян, у кароткі тэрмін дабіліся поўнай ліквідацыі прарыву. Гэта выразны прыклад таго, чаго можна дабіцца там, дзе масы арганізаваны вакол баявых чарговых пытаньняў, дзе заместкіраўнікі і самацёку дзейнічае сапраўдная бальшавіцкая воля, дзе сапраўды ажыцьцяўляюцца ўдарныя тэмпы работы.

Партыя і ўрад на працягу двух месяцаў кампаніі па мабілізацыі сродкаў ня раз канстатавалі, што ліквідацыя прарыву ў фінпляне праходзіць неадвальняюча, што барацьба за выкананьне фінансавага пляну належным чынам не разгорнута. Аднак, і да гэтага часу патрэбнага пералому няма. Райкомы і райвыканкомы не аддалі гэтаму пытаньню належнай увагі, ня здолелі ўвязаць яго з радам іншых палітычна-гаспадарчых пытаньняў. Кампанія па маб

За бальшавіцкае ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі

БЕЛАРУСІЗАЦЫЮ—НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ

Не паслабляючы ні на хвіліну барацьбы супроць нацыянал-дэмакратызму,—накіраваць агонь па вялікадзяржаўным шавінізьме, самым небясьпечным на даным этапе

Больш канкрэтнай работы!

На XII зьезьдзе РКП(б) у сваім дакладзе тав. Сталін сказаў: «НЕАБХОДНА, КАБ НЯ ТОЛЬКІ ШКОЛЫ, АЛЕ І ЎСЕ УСТАНОВЫ, УСЕ ОРГАНЫ ЯК ПАРТЫЙНЫЯ, ТАК І САВЕЦКІЯ... ВЯЛІ СВАЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ НА МОВЕ, ЗРАЗУМЕЛАЙ ДЛЯ МАС». У рабоце над тым, каб партыйны, дзяржаўны і прафсаюзны апарат вёў сваю дзейнасьць і ўсю практычную работу на мове, зразумелай для шырокіх мас рабочых і бядняцка-серадняцкага сялянства, КП(б)Б набыла вялізарныя посьпехі. Работа цэнтральных устаноў раённага і сельсавецкага апарату пераведзена на беларускую мову. Беларуская пралетарская культура, пралетарская літаратура, пры ўсямернай садзейнасьці партыйных арганізацый, з кожным днём усё шырэй і шырэй укараняецца ў масы рабочых, калгаснікаў і бядняцка - сераднякіх пластоў вёскі. Посьпехі КП(б)Б ў справе практычнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі відавочны і бясспрэчны.

Было-б грубейшай палітычнай памылкай, гаворачы аб посьпехах, маўчаць аб тых прарывах, якія ёсьць на пасобных вучастках барацьбы за правядзеньне нацыянальнай палітыкі партыі. Было-б крайняя памылкова скрывець, што пасобныя пізавыя партыйныя зьвеньні — парт'ячэйкі — недаацэньваюць значэньня беларусізацыі, не вядуць барацьбы з супраціўленьнем, якое аказваюць вялікадзяржаўныя шавіністы правядзеньню беларусізацыі.

Некаторыя пасобныя ячэйкі КП(б)Б не МАБІЛІЗАВАЛІ МАС НА БАРАЦЬБУ З САМЫМ НЕБЯСЬПЕЧНЫМ НА ДАНЫМ ЭТАПЕ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНЫМ РАСІЙСКІМ ШАВІНІЗМАМ, не давалі адпору выпадкам расійскіх шавіністых.

Вялікадзяржаўныя шавіністыя шалёна супраціўляюцца беларусізацыі. Партыйныя ячэйкі не заўсёды ўжывалі жорсткія меры, накіраваныя на тое, каб зламаць гэтае супраціўленьне. Матар'ялы, якія мы ніжэй зьмяшчаем, выразна паказваюць, што нават рад камуністых, рад кіруючых работнікаў прафарганізацый недаацэньваюць значэньня работы па ажыцьцяўленьні нацпалітыкі партыі, ІГНАРУЮЦЬ РАБОТУ З НАЦМЕНШАСЬЦЯМІ, па - прымірэнцку адносяцца да вялікадзяржаўных шавіністых.

«Зьвязда» на сваіх стороннах шмат разоў завастрала ўвагу партыйных арганізацый на фактах недапушчальных адносін з боку пасобных устаноў да беларусізацыі. Мы паказвалі на рад канкрэтных віноўнікаў, якія прыпынялі ход беларусізацыі, мы паказвалі на канкрэтных носьбітаў супраціўленьня беларусізацыі, якія ігнаруюць беларускую мову. Мы сёньня маем права спытаць у партыйных ячэек і прафсаюзных арганізацый, што яны зрабілі ў адносінах гэтых канкрэтных віноўнікаў дрэннага правядзеньня беларусізацыі? Мы маем права патрабаваць адказу на пытаньне: што парт'ячэйкі і прафарганізацыі на прадпрыемствах, ва ўстановах зрабілі для зьнішчэньня тых перашкод, якія стаяць на шляху практычнага ажыцьцяўленьня нацпалітыкі партыі, у прыватнасьці—беларусізацыі?

Не рэзалюцыямі, ня пустой фразяпёліяй, не агітацыяй, а практычнай канкрэтнай работай, бязьлітасным змаганьнем з вялікадзяржаўным шавінізмам, беларускім контр - рэвалюцыйным нацыянал - дэмакратызмам і шавінізмамі ўсіх копераў партыйныя ячэйкі павінны рашуча палепшыць сваю работу па беларусізацыі ды інтэрнацыянальным выхаваньні мас. Менш пустых фраз — больш канкрэтнай справы, канкрэтнай работы на вучастку ажыцьцяўленьня нацпалітыкі! Тыя недахопы ; перашкоды, тыя фармальныя адносіны да беларусізацыі, якія яшчэ сям-там назіраюцца, павінны быць зьнішчаны. Фронт барацьбы за бальшавіцкае ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі павінен быць вызначаны. Для гэтага трэба падцягнуцца на адсталых вучастках. Партыйныя арганізацыі дабіваюцца гэтага праз настойлівую бальшавіцкую работу, праз мабілізацыю шырокіх мас рабочых і працоўнага сялянства, на барацьбу супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, самага небясьпечнага на даным этапе і шавінізмаў усіх копераў. Новых посьпехаў у практычным ажыцьцяўленьні нацпалітыкі партыйныя арганізацыі дабіваюцца толькі пры ўмове настойлівага дастасаваньня ленінскіх прынцыпаў у сваёй практычнай рабоце на даным вучастку.

Вылазка антысэміта на Бабруйскім камбінаце

У фанэрным цэху Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату гэтымі днямі месца месца вылазка антысэміта Матросава. Матросаў запёр рабочага кіроўцу Грынберга ў парыльню і пусьціў туды вострую пару. Гэта пакрыўдзіла сьмерцю рабочаму Грынбергу. Ён выратаваны толькі дзякуючы таму, што адзін з рабочых дагледаўся аб тым, што Грынберг запёрты ў парыльню і яго, ледзь жывога, выратавалі.

Свой ганебны ўчынак, антысэміт Матросаў суправаджаў выкрыкамі: «К чорту жыдоў, траба ад іх ачысьціцца, ім ня месца на камбінаце». Антысэміцкія выступленьні з боку Матросава былі і раней, але партыйная і прафсаюзная арганізацыі па іх да гэтага часу не зварачалі ўвагі.

Як зараз высьветлілася, Матросаў зьяўляецца былым скупшчыкам жывёлы, былым гандляром. Быў пад судом, прысуджаны да прымусовых работ, але зьбег адтуль. Гэтыя рысы дапаўняюць твар антысэміта Матросава.

Рабочыя камбінату, жорстка асудзілі гэту антысэміцкую вылазку. Матросаў выключаны з саюзу, звольнены з работы і аддаецца пад суд.

Бязьдзейнасьць парт'ячэек—на руку вялікадзяржаўным шавіністым

(ГОМЕЛЬ)

Практычнае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі ў галіне беларусізацыі, як адной з сустаўных частак нацпалітыкі, у радзе ўстаноў і прадпрыемстваў Гомельшчыны праводзіцца зусім невыстарчальна.

Пасобныя парт'ячэйкі, мясцкомы і фабзаўкомы праяўляюць апартуністычную бязьдзейнасьць у справе правядзеньня беларусізацыі, невыстарчальна разгарнулі работу па інтэрнацыянальным выхаваньні мас, не мабілізуюць як належыць пралетарскую грамадзкасьць на бязьлітасную барацьбу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, беларускага нацыянал - дэмакратызму ды інш. відаў шавінізму.

Паслабленьне клясавай пільнасьці, кожны найменш прарыў на пасобных вучастках нашага сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі, імкнуцца выкарыстаць варожыя дыктатуры пралетарыяту элементы. «Зьвязда» нядаўна зьмяшчала на сваіх стороннах абураючыя факты вялікадзяржаўнага шавінізму ў Гомельскім ФЗВ, аб тым, як вялікадзяржаўныя шавіністыя зьвілі сваё контр - рэвалюцыйнае гняздо ў ФЗВ і доўгі час цкавалі выкладчыка беларускай мовы.

Таксама разьвілі сваю контр-рэвалюцыйную дзейнасьць шавіністыя ў Гомельскім чыгуначным тэхнікуме. Шавіністычныя элементы прабілі свой варожы ўплыў на частку вучняў. У мінулым былі выпадкі, калі вучні палілі беларускія падручнікі, пісалі на іх контр - рэвалюцыйнага зьместу лёзунгі і г. д.

Шавіністыя называлі беларускую мову мужыцкай, хітайскай і адмаўляліся не вывучаць і ўжываць. На гэтым контр - рэвалюцыйным праяўленьні партыйная арганізацыя чыгуначнага тэхнікуму ў свой час рэагавала, але потым работу ў напрамку правядзеньня выразнай ленінскай нацпалітыкі паслабіла. Таму элементы з лягеру вялікадзяржаўнага шавінізму ў тэхнікуме, асабліва на 4-м курсе, за апошнія часы ўзмацнілі сваю варожую дзейнасьць, актыўна выступаюць супроць правядзеньня беларусізацыі.

Напрыклад, студэнт **Радзько** заяўляе: «Я ніяк згаджуся вывучаць італьянскую ці якую хочаце мову, толькі не беларускую».

— Беларускую мову вывучаць ня буду. і ў Беларусі не застануся — дадае **Русецкая.**

Студэнты **Барскі, Барышэўскі, Воўкаў, Краскоўскі, Лугавы, Лікас, Смуцін і Чарняёў** абвясьцілі байкот вытучэньню беларускай мовы. У мінулым годзе яны не вывучалі беларускай мовы, залік ім адтэрміналі да гэтага году, але і сёлета беларускую мову вывучаць яны ня хочуць.

Вучні 2-га курсу перашкаджаюць настаўніку Мігаю чытаць лекцыі на беларускай мове, а патрабуюць выкладаць на расійскай.

З боку некаторых настаўнікаў таксама назіраецца супраціўленьне правядзеньню беларусізацыі. Некаторыя з іх імкнуцца апраўдаць сваё супраціўленьне адсутнасьцю падручнікаў на беларускай мове. Пасобныя настаўнікі пасьля таго, як атрымалі пэўны тэрмін для беларусізацыі, перагляліся ў іншыя навучальныя ўстановы.

З другога боку, у гэтым-жа тэхнікуме ёсьць пэўныя карэньні антысэмітызму. Антысэміты пішуць чорнасоценныя лёзунгі. У часе работы 4-га курсу ў калгасе меді месца адкрытыя антысэміцкія выпадкі з боку пасобных студэнтаў.

Такое становішча ў чыгуначным тэхнікуме сыгналізуе аб нездольнасьці парт'ячэйкі кіраўніцтва тэхнікуму выразна праводзіць нацыянальную палітыку партыі і бязьлітасна змагацца супроць шавінізмаў розных колераў і антысэмітызму.

Правы антысэмітызму шырока распаўсюджаны і ў гомельскай канторы сувязі. Парт'ячэйка і саюз ніякай работы не праводзяць па інтэрнацыянальным выхаваньні мас. Сярод служачых ёсьць выпадкі нацыянальнай варожасьці. Найбольшай небясьпекай у канторы зьяўляецца антысэмітызм. Нядаўна быў выключан з партыі і саюзу антысэміт **Зонез**, але антысэміты яшчэ засталіся нават і ў складзе ячэйкі. Калі ў газэтную экспэдыцыю зьявіўся на работу яўрэй Эвэнтаў, загадчык экспэдыцыяй, член партыі, **Лімэз** заўважыла:

— Ты пажыдоўску не гавары, бо мы гэтай мовы не разумеем.

У гэты час, калі варожым нам элементы асабліва активізуюцца, павінна быць павялічана клясавая пільнасьць з боку партыйных арганізацый і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці і ўзмоцнена барацьба супроць шавінізмаў і антысэмітызму.

Вядучы бязьлітасную барацьбу супроць шавінізму розных відаў, асабліва супроць расійскага вялікадзяржаўнага шавінізму, як найбольш небясьпечнага, трэба рашуча змагацца з апартуністычнай недаацэнкай у радох парт-арганізацый работы па правядзеньні беларусізацыі

Я—скі.

За марксыцка-ленінскую навуку

Апублікаваная ўчора пастанова бюро Фрунзаўскага райкому КП(б)Б паставіла ва ўсю шырыню пытаньне аб пераўтварэньні Беларускай Акадэміі Навук у сапраўдны цэнтр пралетарскай навукі.

Вырашэньне гэтай складанай задачы патрабуе найвялікшага намаганьня ўсіх камуністычных, усіх марксыцкіх навуковых сіл БССР. Перад намі стаіць задача — ператварыць БАН у важнейшы прывадны пас нашага сацыялістычнага будаўніцтва, у апорны пункт навукова-дасьледчай работы, якая дапамагае партыі, ураду, рабочай клясе Беларусі будаваць сацыялізм, у фабрыку новых навуковых кадраў, упоўнена ўладаючых мэтадалёгічнай зброяй марксызму - ленінізму. Вакол гэтай адказьнейшай і складанейшай задачы павінны быць мабілізаваны ўсе тыя навуковыя работнікі, чые веды могуць служыць справе пралетарскай дыктатуры.

Катэдра марксызму - ленінізму Акадэміі Навук, асноўнай задачай якой зьяўляецца барацьба за марксыцкую гегемонію ў БАН, за укараненьне дыялектыка - матар'ялістычнай мэтадалёгіі ва ўсю навуковую работу Беларусі, на працягу доўтага часу не магла з посьпехам выконваць гэтай задачы. Бюро райкому прызнала, што кіраўніцтва БАН у сваіх адносінах да катэдры марксызму - ленінізму «дапусьціла грубейшую палітычную памылку... якая выявілася ў тым, што замест накіраваньня ўвагі Акадэміі на барацьбу з буржуазнымі плынямі і нацыянал-дэмакратызмам і замест дапамогі катэдры ў гэтай справе, раскрытыкавала яе работу такім чынам, што аб'ектыўна дапамагло нацыянал - дэмакратам у іх нападках на катэдру».

Пералом, які наступае ва ўсёй рабоце Акадэміі, ператварэньне БАН у кузьню беларускай пралетарскай навукі, ускладае на кожнага работніка Акадэміі асаблівую палітычную адказнасьць. Удубальт нясуць гэту адказнасьць работнікі катэдры марксызму-ленінізму, катэдры ваяўнічага матар'ялізму.

Улічваючы выключную важнасьць заваяваньня марксыцка - ленінскай гегемоніі ва ўсёй навукова - дасьледчай рабоце БССР і ролю, якая прыпадае ў гэтых адносінах на нас, катэдра марксызму - ленінізму Беларускай Акадэміі Навук на пасяджэньні ад 15 кастрычніка пастанавіла абвясьціць сябе ўдарнай.

У рэалізацыю гэтай пастановы прымаем на сябе абавязацельства на працягу бягучага акадэмічнага году:

1. Здаць у друк 50 аркушаў навукова-дасьледчых работ.

2. Выпусьціць рабочую кнігу па дыялектычным матар'ялізьме на беларускай мове і падручнікі па гістарычным матар'ялізьме на яўрэйскай мове.

3. Выдаць бібліяграфічны паказальнік па нацыянальным пытаньні ў БССР.

4. Выдаць зборнік па пытаньнях рэлігіі і атэізьме.

5. Выпусьціць 6 папулярна-навуковых брашур на пытаньнях дыялектычнага матар'ялізму для партыйнага і рабочага актыву.

6. Арганізаваць пераклад на беларускую мову клясыкаў марксызму ня менш чым на 20 аркушаў.

7. Арганізаваць 25 навукова-дасьледчых дакладаў.

8. Правесьці 50 навукова - папулярных дакладаў на фабрыках і заводах для партыйцаў і прафактыву — з іх палову ў раёнах БССР.

9. Арганізаваць цыкл лекцый па дыялектычным матар'ялізьме ў клюбе навуковых работнікаў.

10. Правесьці мэтадычную канфэрэнцыю настаўнікаў грамадазнаўства ў Менску.

11. Арганізаваць 9 сыстэматычных сэмінараў па дыялектычным матар'ялізьме для 160 асьпірантаў розных спэцыяльнасьцяй.

Лічачы асабліва важнай задачу сыстэматычнай і канкрэтнай крытыкі ўсёй друкаванай прадукцыі, выпушчанай у Беларусі рознага роду клясавароржымі «кучопымі», якія выкарыстоўвалі ў мэтах палітычнай барацьбы з дыктатурай пралетарыяту Акадэмію Навук, таксама і некаторыя іншыя нашы навуковыя цэнтры, катэдра марксызму - ленінізму арганізавала 7 брыгад, на якія ўскладзены абавязак правесьці гэту крытыку.

Мы спадзяемся, што ў бліжэйшы час зможам паказаць пралетарскай грамадзкай думцы Беларусі, як выкарыстоўвалася навука ў мэтах актыўнай барацьбы з савецкай уладай, у інтарэсах невыкарчаваных яшчэ элемэнтаў капіталізму.

Нікай жыве марксыцка - ленінская навука, якая актыўна дапамагае будаўніцтву сацыялізму ў БССР!

Няхай побач з пралетарскімі ўдарніцкімі кадрамі пашыраецца ўдарніцтва на культурна - ідэалёгічным фронце!

Катэдра марксызму - ленінізму Беп. Ак Навук С. Я. Вальфсон, Р. Выдра, Я. Н. Сякерская, А. Валабрынскі, П. Н. Сякерская, Н. Шалавалаў, Е. Крывіцкі, А. Аратунянц, А. Ноткін, Б. Леванчук, Л. Бэбровіч, Чмыхоў, Мацьвяёнак, Баранаў, Н. Дырэнторанка.

КЛЮБ ДРУКАРОЎ | СУСТРЭЧА РАБКОРАЎ | 22 КАСТРЫЧНІКА

з праўленьнем МЦРК

Цэнтральныя газэты: «ЗЬВЯЗДА», «РАБОЧЫ», «АКЦЯБР», «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», і «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

сумесна з Праўленьнем МЦРК наладжваюць:

ВЕЧАР ПЫТАНЬНЯЎ І АДКАЗАЎ

аб рабоце МЦРК

На ўсе пытаньні, якія цікавяць рабкораў, будуць даны адказы членамі праўленьня і адказнымі работнікамі МЦРК.

Пасьля дзелавой часткі—выступленьне гіпнатызёра Н. А. АРНАЛЬДО.

На вечар запрашаюцца ўсе рабкоры цэнтральных, шматтыражных і пасьцен. газэт.

Уваход па запрашальных білетах, якія выдаюцца ў рэдакцыях цэнтральных газэт.

Пачатак а 7 гадзіне ўвечары

ШАВІНІСТЫЯ СУПРАЦІЎЛЯЮЦЦА

разгортваньню работы сярод рабочых-палякаў

На прадпрыемствах гор. Менску працуе шмат рабочых палякаў. На заводзе «Камунар» з агульнай колькасьці рабочых 16 проц. альбо 180 чал. складаюць рабочыя палякі, на заводзе «Бальшавік»—70, «Энэргіі»—40 і г. д. Аднак, пасобныя фабрычна-заводзкія партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі ў сваёй практычнай рабоце па ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі ў галіне нацпалітыкі не аддаюць патрэбнай увагі культурнаму абслугоўваньню рабочых нацменшасьцяй на іх роднай мове. Некаторыя з іх сваю бязьдзейнасьць у гэтай справе апраўдваюць адсутнасьцю на прадпрыемствах рабочых нацменшасьцяй.

На заводзе «Камунар» сярод рабочых палякаў ніякай культурнай работы на польскай мове не праводзілася. У клюбе зусім няма польскай літаратуры. Такое становішча сакратар бюро парткалектыву тлумачыць тым, што «сапраўдных палякаў на заводзе няма, а калі ёсьць адзінкі, дык ніякай работы сярод іх праводзіць нямэтазгодна».

Словы са справамі не разыходзяцца. На гэтым-жа заводзе не зварачаецца належнае ўвагі на задачу ўцягненьня рабочых нацменшасьцяй у кіруючую работу прафсаюзнай і грамадзкіх арганізацый. Паводле думкі старшыні заўкому, «нацыянальны склад пры выбарах у кіруючы орган якой-небудзь заводзкай грамадзкай арганізацыі ўлічваць ня трэба».

Партыйная і прафсаюзная арганізацыі заводу «Камунар» не мабілізавалі рабочых мас на барацьбу супроць шавіністычных праяў, якія маюць месца на прадпрыемстве. Тых рабочых палякаў, якія гавораць паміж сабою на польскай мове, адсталыя рабочыя іншых нацыянальнасьцяй называюць «панамі». Такім праяўленьням вялікадзяржаўнага шавінізму ня было дана рашучага адпору.

ЦП саюзаў мэталістых і гарбароў выдалі калдагавары на двух-трох мовах, мэталістыя—на двух мовах, забыўшыся аб тым, што ў БССР 4 дзяржаўных мовы і што на прадпрыемствах саюзу мэталістых і гарбароў працуюць рабочыя палякі. Кіраўніцтву гэтых саюзаў ужо час зразумець важнасьць задачы разгортваньня работы сярод рабочых нацменшасьцяй. ЦСПСБ трэба зрабіць праверку выкананьня прафарганізацыямі пастановы ЦСПСБ па пытаньні працаводы на прадпрыемствах.

М. Маззнце.

Кожны рабочы павінен ведаць умовы конкурсу

На менскіх прадпрыемствах абмяжоўваюцца гучнымі рэзалюцыямі

РАБОЧЫЯ ФАБРЫК „КАСТРЫЧНІК", „БЕЛАРУСКА", АБУТКОВАЙ, ЗАВОДУ „ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК" І ЭЛЬВОДУ НЯ ВЕДАЮЦЬ УМОЎ КОНКУРСУ

ФАБЗАЎКОМЫ, СТАНЬЦЕ НА ЧАЛЕ НОВАГА ЎЗДЫМУ МАС

Першы этап уключэньня ва ўсесаюзны конкурс на радзе прадпрыемстваў ужо прайшоў. Гэты этап вызначыўся, галоўным чынам, урачыстымі сходамі або мітынгамі, на якіх ухваляні рэзалюцыі аб далучэньні да конкурсу. Здавалася-б, што пасьля гэтага павінна пачацца практычная работа па далейшым замацаваньні гатоўнасьці рабочых мас на справе давесьці сваю здольнасьць быць НЕ АПОШНІМІ сярод лепшых прадпрыемстваў. І зразумела, што ў першую чаргу трэба было-б ДАВЕСЬЦІ УМОВЫ КОНКУРСУ ДА КОЖНАГА РАБОЧАГА, каб кожны ведаў, якія мэты ён павінен сабе паставіць для ПЕРАМОГІ.

На жаль, праверка, якую «Зьвязда» ўчора нападзіла па менскіх прадпрыемствах, паказвае, што БОЛЬШАСЬЦЬ З ІХ АБМЕЖАВАЛАСЯ ВЫКЛЮЧНА ЎРАЧЫСТЫМІ СХОДАМІ І МІТЫНГАМІ. Лёзунг, які «Зьвязда» за апошні час высоўвала шмат разоў, лёзунг—аб давядзеньні ўмоў уссесаюзнага конкурсу да кожнага рабочага, НЕ ПАЧУТЫ АМАЛЬ НІ АДНЭЙ ЗАВОДЗКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ ТЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, ЯКІЯ ПРАВЯРАЛІСЯ.

На швэйнай фабрыцы «КАСТРЫЧНІК», якая ўключылася ва ўсесаюзны конкурс на агульна-фабрычным м'тынгу, апрача гэтага НІЧОГА НЯ ЗРОБЛЕНА.

Рад рабочых, да якіх прадстаўнік «Зьвязды» зьвярнуўся з пытаньнем аб конкурсе, НЯ ВЕДАЛІ, ШТО АДКАЗАЦЬ. Нават некаторыя ЎДАРНІКІ аб конкурсе нічога ня ведаюць. Частка рабочых, якая прысутнічала на мітынгу, ведае, што прадпрыемства ўключылася «ў нейкі конкурс», А ПРА ЎМОВЫ КОНКУРСУ НІХТО НЯ ЧУЎ. Толькі пасьля візыту прадстаўніка рэдакцыі, сакратар бюро парткалектыву вызначыў рад мерапрыемстваў па давядзеньні ўмоў конкурсу да кожнага рабочага.

На галянтарэйнай фабрыцы «БЕЛАРУСКА» ня ведае ніхто ня толькі аб умовах конкурсу, але нават аб самім конкурсе. І гэта датычыць ня толькі рабочых, але і КІРУЮЧАГА СКЛАДУ. Старшыня фабкому чакае пакуль ЦП саюзу або іншая арганізацыя паклапоціцца (!) ўключыць фабрыку ў конкурс. Пра парадак уключэньня ў конкурс ён НЯ ЧЫТАЎ.

На ЭЛЬВОДЗЕ кіраўнікі аб конкурсе яшчэ наогул ня думаюць. Рабочыя не інфармаваны. Некаторыя ўдарнікі (КЛІМКОВІЧ і інш.) чыталі ў газэтах аб конкурсе, пічаць, што і ЭЛЬВОДУ ТРЭБА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У КОНКУРСЕ, але вось «заўком нечага чакае».

На заводзе «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК» 16 кастрычніка адбыўся мітынг, прысьвечаны конкурсу. Зразумела—уключыліся. На гэтым паставілі кропку. Рабочыя аб умовах конкурсу НЯ ВЕДАЮЦЬ. Пасьля наведваньня прадстаўніка «Зьвязды», сакратар парткалектыву абяцаў «сёньня-ж» уключыць у план работы мерапрыемствы па давядзеньні ўмоў конкурсу да кожнага рабочага.

Тав. ІЗЬВЯКОЎ—рабочы паравога-будаўнічага заводу імя «Камінтэрну» ў Харкаве (рабочы стаж—38 год)—за выкананьне прамфінпляну атрымаў у якасьці прэміі білет на кругавое падарожжа па СССР.

Такі-ж малюнак на МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫЦЫ: у конкурс уключыліся, але аб умовах конкурсу нікому з рабочых НЕ ПАВЕДАМІЛІ.

Не памыляючыся, можна сказаць, што і на многіх іншых прадпрыемствах мы спаткалі-б такі-ж малюнак. Дарэчы, ні на адным заводзе ня відаць нават кароценькага пёзунгу.

Вывады праверкі прымушаюць нас з усёй рашучасьцю паставіць пытаньне перад пралетарскай грамадзкасьцю і патрабаваць НЕАДКЛАДНАГА ПЕРАЛОМУ ў гэтай справе. Вывады праверкі сьведчаць АБ ДАЛЁКА НЯСУР'ЁЗНЫМ ПАДЫХОДЗЕ КІРУЮЧЫХ ЗАВОДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ, у першую чаргу, ФАБЗАЎКОМАЎ, ДА УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ, сьведчаць аб НЕДААЦЭНЦЫ ЎСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ, ЯК АСНОЎНАГА МЭТАДУ ВЫКАНАНЬНЯ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ.

Журы ўсебеларускага конкурсу на тры пераходныя сьцягі—ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ — абвясьціла 10-дзённую пераклічку ўсіх гарадзкіх і райпрафсаветаў па пытаньні аб ходзе ўключэньня прадпрыемстваў ва ўсесаюзны і ўсебеларускі конкурсы. Гарадзкія і райпрафсаветы павінны арганізаваць масы ўсіх прадпрыемстваў на ўключэньне ў конкурс, памятаючы, што апошнім тэрмінам уключэньня зьяўляецца 1 ЛІСТАПАДА.

Разам з гэтым трэба праверыць—ЦІ ДАВЕДЗЕНЫ ЎМОВЫ ЎСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ ДА КОЖНАГА РАБОЧАГА, што зьявіцца АДЗІНАЙ ГАРАНТЫЙЙ САПРАЎДНАГА ЎДЗЕЛУ Ў КОНКУРСЕ, УДЗЕЛУ НА СПРАВЕ, А НЯ ТОЛЬКІ Ў РЭЗАЛЮЦЫЯХ.

* * *

Рэдакцыя газэты «ЗЬВЯЗДА» для палягчэньня пізавым праф. і партарганізацыям давесьці ўмовы ўсесаюзнага конкурсу да кожнага рабочага, таксама азнаёміць усіх сваіх рабочых чытачоў з умовамі конкурсу, — выпускае ЗАЎТРА дармовы дадатак да «Зьвязды», ПРЫСЬВЕЧАНЫ ЎМОВАМ УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ.

„ДЭЗЭРТЫРСТВУ" СПЭЦЫЯЛІСТЫХ НЕ ПАВІННА БЫЦЬ МЕСЦА!

Калі прамфінплян не даведзены да варштату...

Вытворчыя манэўры па заводзе «Камунар» пачаліся з 15-га кастрычніка. Ужо ёсьць пэўныя вынікі. Прагулаў 1-2 у дзень, спазьненьні нязначныя. Кожнаму не ахвота траціць на чорную дошку, якая вісіць па дварэ і на якую прозьвішчы прагульшчыкаў запісваюцца вялікімі літарамі.

Так, у бляшаным цэху 16-га кастрычніка ня было ні аднаго спазьненьня і ні аднаго прагулу. У ліцейным цэху толькі рабочы Тоўсьцін спазьніўся на 10 мінут, а рабочы Аляхновіч зусім не зьявіўся.

— У кастрычніку мы павінны выпусьціць 50 камандрабілак, а за два тыдні выпусьцілі толькі 10; няма дэталяй,—заяўляе майстар мэханічна-зборачнага цэху.

Ударная брыгада т. Лютарэвіча патрабуе неадкладнага зьнішчэньня непарадкаў цэху, якія перашкаджаюць выкананьню пляну па зборцы фурманак Скурсындыкату і паказвае, што іменна перашкаджае ў рабоце.

Падшыпнікі бракаваныя, нягодныя вілкі, восі даўжэй належнага разьмеру.

Майстар гэтага цэху т. Гобэльман паклікаў неяк загадчыка кантрольнага аддзелу і запытаўся, чаму з такарнага цэху ідзе бракаваны паўфабрыкат. Загадчык кантрольнага аддзелу т. Скрынко адказаў на гэта.

— Ня ваша справа, я тут гаспадар!

Прышлося зьвярнуцца ў штаб. Член штабу тав. Шулькін кліча Скрынко ў цэх, паказаць пікудышныя вынікі яго работы па прыёмцы дэталяй. Скрынко адмаўляецца: няма часу, і калі ўсётакі ўдалося ўгаварыць яго пайсьці ў цэх, Скрынко са злосьцю кінуў:

— Манэўры не даюць мне працаваць. Кожны капаецца ў драбніцах.

Гаспадарнікі і інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі ў баку ад вытворчых манэўраў.

Тэхнік-канструктар Шапіра гаворыць:

— Я чалавек беспартыйны, мяне гэтая справа не датычыць.

Плянавае забесьпячэньне цэхаў паўфабрыкатамі амаль што адсутнічае.

Вельмі дрэнна манэўраваць, калі прамфінплян не даведзены да рабочых. Хаця загадчык плянавага аддзелу і гаворыць: у нас плян даведзены да кожнага варштату, але ў ім ніхто з рабочых дакладна не разьбіраецца, таму, што ў пляне паказаны сумарныя даныя і толькі часткова—колькасныя паказальнікі. На які процант той, або іншы цэх выканаў заданьне —гэтага вам ня скажуць нават у штабе кіраўніцтва манэўрамі. Спасылаюцца на тое, што няма магчымасьці наладзіць інфармацыю аб штодзённым выкананьні...

Цэхавыя арганізацыі асобных цэхаў зразумелі вытворчыя манэўры так, што ім у часе саміх манэўраў і рабіць няма чаго: іх заменіць штаб. Пасобныя рабочыя гавораць:

— Націскай на выпрацоўку; хутка нормы перагледзяць!

На апошнім пасяджэньні штабу высьветлілася, што адміністрацыя ня ўжыла ніякіх мерапрыемстваў па забесьпячэньні цэхаў інструментамі і паўфабрыкатамі. На сёньняшні дзень ёсьць парушэньні прынцыпу адзіначальля. У ліцейным цэху замест 16 чалавек працуе 9. Старэйшы рабочы т. Кітайчык прыходзіць у ліцейны цэх і зьнімае з работы рабочых, не запытаўшы майстра.

Зараз унутры заводу абвешчаны конкурс па лепшы цэх. Гэта дапаможа зьнішчыць недахопы ў рабоце і ўзьнімае якасьць выкананьня прамфінпляну ўдарнага кварталу. Пакуль што-ж манэўры мала чаго далі вытворчасьці. У самым хуткім часе трэба чакаць значна большага.

А. М.

Вытворчыя манэўры дадуць новы імпэт

Адозва ЦК УсеКП(б) была прапрацавана рабочымі акуляриай фабрыкі са спазьненьнем. Рабочыя адказалі партыйнай арганізацыяй 6 ударных брыгад, замацаваньнем сябе на вытворчасьці да канца пяцігодкі; 120 чалавек абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя трэцяга году пяцігодкі.

Паступіла 100 рабочых прапаноў. Быў скліканы штаб па ліквідацыі прарыву. Дзякуючы энэргічнай рабоце членаў штабу і энтузіязму саміх рабочых, прарыў першага кварталу ўдалося ліквідаваць і выканаць прамфінплян на 98,5 проц. Лепшыя ўдарнікі зараз вылучаны на кіраўнічую работу (т. т. Хайкін, Звонак, Геншафт, Ханін, Юдовін, Сьвярдлоў, Хацімскі).

За лепшыя прапановы і эфэктыўнасьць ударніцтва 75 асоб былі прэміраваны. Інструктару - вылучэнцу Лопуханай за энэргічнае кіраўніцтва цэхам (у выніку чаго быў датэрмінова выкананы прамфінплян) прадстаўлена паўвуковая камандыроўка ў Маскву.

Але на фабрыцы ёсьць і недахопы, на ліквідацыю якіх павінна быць мабілізавана цяпер уся ўвага грамадзкіх рабочых, ёсьць факты рвацтва, парушэньня працоўнай дысцыпліны, на стварэньне грамадзкай думкі вакол барацьбы з гэтымі.

Партыйцы і камсамольцы далёка не заўсёды зьяўляюцца арганізатарамі, прыкладам для беспартыйнай масы

15 кастрычніка фабрыка ўступіла ў вытворчыя манэўры. Арганізаваны штаб, вызначаны пасты і выведчыкі.

ЦВЭЙ.

АРГАНІЗУЕМ КУЛЬТПАХОД

„Мы павінны ўзяцца за простую, істотную справу—мабілізацыю пісьменных для барацьбы з няпісьменнасьцю" (ЛЕНІН)

За ўдарнымі тэмпамі

Некалькі дзён таму назад пачаўся ўсесаюзны агляд усеагульнага навучаньня. 25 кастрычніка пачынаецца ўсебеларуская культ-эстафэта. Культ-эстафэта мае вялікае палітычнае значэньне, як сродак, пры дапамозе якога будзе нападжана масавая праверка выкананьня дырэктыў партыі аб культурным будаўніцтве.

Дзе-ні-дзе да выкананьня гэтых баявых дырэктыў падыйшлі фармальна, без прыцягненьня шырокіх мас на барацьбу за высокія тэмпы ў ажыцьцяўленьні задач культурнай рэвалюцыі.

Культ-эстафэта, як сродак масавага агляду і праверкі, павінна выкрыць канкрэтныя факты скрыўленьня клясавай лініі ў рабоце па ўвядзеньні ўсеагульнага навучаньня. Трэба высьвятліць, як ідзе барацьба за палітэхнізацыю школы, за савецкія настаўніцкія кадры. Трэба з усёй настойлівасьцю выкрываць людзей, якія проста, або ўкосна сабатуюць падрыхтоўку кадраў, сабатуюць правядзеньне палітэхнізацыі школ.

Культ-эстафэта павінна мабілізаваць савецкую, і ў першую чаргу партыйную, грамадзкасьць на ажыцьцяўленьне задач па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Кожны член партыі павінен памятаць, што ліквідацыя няпісьменнасьці — гэта справа ня толькі органаў НКА, але справа ўсіх партарганізацый і ўсяе савецкае грамадзкасьці.

Посьпех культ-эстафэты будзе зведжыць ад таго, наколькі партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя і грамадзкія арганізацыі ўлічаць палітычную важнасьць праведзенага мерапрыемства і наколькі яны будуць здольнымі стаць на чале руху мас за ажыцьцяўленьне задач культурнай рэвалюцыі.

Створым баявыя штабы

Пачатак ус

ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ ЗМАГАНЬНЯ

ЗА ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫШЭНЬНЕ ПАСЕЎНАГА ПЛЯНУ Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ

Злучыць асеньнюю с.-г. кампанію з новым калгасным прылівам

МЕНСК, 20 кастрычніка

Асеньняя с.-г. кампанія на сёнешні дзень праходзіць яшчэ **НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА.** Па гледзячы на рад бясспрэчных посьпехаў, дасягнутых часткай раёнаў, ход сяўбы азімых і зяблівага ворыва **не гарантуе** свячасовага і поўнага выкананьня пляну. Дынаміка сяўбы за мінулую пяцідзеўку сыгналізуе аб фактычным **зьніжэньні** тэмпаў пасеўнай кампаніі. У той час, калі ў нашым распараджэньні засталіся, літаральна, лічаныя дні, на працягу якіх яшчэ можна праводзіць сяўбу, трэцяя пяцідзеўка кастрычніка дае ганебна малое, зусім невыстарчальнае павялічэньне засеянай плошчы. Частка раёнаў за мінулую пяцідзеўку зусім не дабілася ніякага зруху ў выкананьні пасеўнага пляну, даючы па 15 кастрычніка паказальнікі, дасягнутыя ў першую дэкаду месяца.

Такое становішча — просты рэзультат апартуністычнага заспакаеньня па дасягнутых выніках, рэзультат праваапартуністычных, самацёчных настрояў, датэрміновай мабілізацыі з пасеўнага фронту з боку часткі раёнаў (Тураў, Крупкі, Бялынічы і інш.).

Партыйныя арганізацыі ў першую чаргу адказваюць за выкананьне пляну сяўбы. Партарганізацыі такіх раёнаў, як **Бялыніцкі, Крупскі, Тураўскі, Чашніцкі** і інш., дзе пасеўны плян стаіць пад сур'ёзным ударам, абавязаны неадкладна дабіцца рашаючага, карэннага пералому ў ходзе сяўбы.

Трэба з сапраўднай бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за кожны засеяны гэктар. Трэба цалкам і поўнасьцю ліквідаваць пасеўны доўг і дабіцца неадкладнага сканчэньня сяўбы, неадкладнага 100%-нага выкананьня пляну. **Зарука перамогі на пасеўным фронце ў бязьлітасным змаганьні з праваапартуністычным самацёкам, у рашучым наступленьні на кулацтва, у найшырэйшай мабілізацыі мас і разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва.**

Калгасы Рэчыцкага раёну, выкананьне пляну сяўбы, ня толькі ня зьнізілі тэмпаў, ня толькі не паслабілі ўвагі да пасеўнай кампаніі, а з падвойнай энэргіяй працягваюць сяўбу. Такіх тэмпаў павінны неадкладна дасягнуць **усе** раёны, якія цягнуцца ў хвасьце пасеўнай кампаніі. **Дні калектывізацыі і ўраджаю павінны стаць днямі пасьпяховага сканчэньня сяўбы і перавышэньня пасеўнага пляну.**

Зяблева мае вялізарнае ня толькі гаспадарчае, але і палітычнае значэньне, зьяўляючыся магутным вагаром арганізацыі новых калгасаў, вагаром новага калгаснага прыліву. Аднак, ня гледзячы на гэта, прыходзіцца з усёй рашучасьцю канстатаваць, што значэньне зяблівага ворава ў значнай частцы раёнаў яўна не дацэньваецца, а часамі проста ігнаруецца, прыходзіцца канстатаваць, што рад арганізацый не аддае гэтай важнейшай справе, літаральна, ніякай увагі. Толькі гэтай акалічнасьцю трэба вытлумачыць з рук вон дрэнны ход зяблівa, які мы маем па сёнешні дзень. Пры цяперашніх тэмпах зяблівага ворыва, выкананьне пляну ўсё яшчэ **не забясьпечана.** На самай справе, па 15 кастрычніка рэспубліканскае заданьне па зяблівy выканана толькі па **27,6 проц.** За трэцюю пяцідзеўку кастрычніка выкананьне пляну зяблівa павялічылася ёсяго толькі на **3,6 проц.** Зусім нікчэмны і мізэрны процант. Гэта сьведчыць аб поўнай няўважлівасьці мясцовых арганізацый да зяблівага ворыва.

Зяблівае ворыва, якое адбываецца ва ўмовах разгорнутага калгаснага будаўніцтва і азначае сабой пачатак падрыхтоўкі да будучай веснавой сяўбы, зьяўляецца **ня толькі вялізарным фактарам узьйму ўраджайнасьці, але і магутнейшым вагаром арганізацыі новых калгасаў, новага прыліву ў існуючыя с.-г. арцелі.** Пасьпяховае правядзеньне зяблівa ў калгасах і разгорнутая масавая работа па арганізацыі ворыва пад зяб **у адну баразну, зьвяжуць, бясспрэчна, вялізарным стымулам да стварэньня новых калгасаў, да новага магуткага калгаснага прыліву.**

Булацтва добра ўзічнае гэта і шалёна імкнецца сарваць правядзеньне ворыва пад зяб. У наасобных мясцох гэтыя спробы **ня сустракаюць патрэбнага адпору.** Вось чаму ігнараваньне зяблівa, недаацэнка гэтай гаспадарча-палітычнай кампаніі зьяўляюцца **палітычнай памылкай праваапартуністычнага характару.**

Карэнны і, пры гэтым, неадкладны пералом у ходзе сяўбы і зяблівa павінен быць зараз-жа дасягнуты. **Асеньняя сяўба і зяблівa павінны быць у максымальнай ступені выкарыстаны ня арганізацыі новага калгаснага прыліву.** Пасеўная кампанія і зяблівa павінны прайсьці пад знакам упартага змаганьня за стварэньне новых калгасаў, для ўцягненьня новых мас калгаснікаў у калектывы. **Шырока арганізуем ворыва пад зяб у адну баразну. Даб'емся неадкладнага выкананьня пасеўнага пляну і заданьня па зяблівy, праводзячы гэтыя важнейшыя кампаніі пад знакам найшырэйшай падрыхтоўкі і арганізацыі новага калгаснага прыліву.**

Посьпехі калгасаў—

у гушчу адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх мас

Максымальна выкарыстаць зяблівa для падрыхтоўкі і арганізацыі новага прыліву ў калгасы. Мацней біць па кулацкіх агентах—правых і „левых" апартуністых, больш рашуча разгортваць бязьлітаснае наступленьне на кулака

СЬЦЕЛЮЦЬ ЛЕН

На баявых пастох калгаснай будоўлі

С.-Г. АРЦЕЛЬ „ЧЫРВОНАЯ ПОЛАЧЧЫНА"

ВЫХОДЗІЦЬ У КАЛЁНЫ УДАРНЫХ КАЛГАСАЎ

Калгас **«ЧЫРВОНАЯ ПОЛАЧЧЫНА»** за 8 месяцаў свайго існаваньня дабіўся вялікіх посьпехаў і здолеў давесьці суседзям-адзінаасобнікам перавагу калгаснай працы. Пасьля часткавага адліву ў калгасе замацавалася буйное ядро з 11 батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Пад кіраўніцтвам сваіх арганізатараў — двух камуністых, калгас па-бальшавіцку даў адпор шалёным спробам кулацтва развяліць маладую арцель і ўдарным тэмпам правёў першую калектыўную сяўбу. Калгаснікі ня толькі **выканалі пасеўны плян і пашырылі пасеўную плошчу,** але і ўзялі на грамадзкі буксір адзінаасобнікаў, у прыватнасьці, «выхадцаў», якія пакінулі калгас пад уплывам кулацкай агітацыі. Гэта зрабіла на іх вялікае ўражаньне. **Адзін за адным пачалі прыходзіць у калгас адзінаасобнікі з просьбай аб прыёме.**

Калгас рос, перамагаючы труднасьці, разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, змагаючыся з кулацтвам і адсталымі настроямі ва ўласных радох. Толькі дзякуючы гэраічнай рабоце калгаснікаў, якія далі прыклад высокай згуртаванасьці і баявых тэмпаў спаборніцтва, «Чырвоная Полаччына», таксама як і вясной, **СПРАВІЛАСЯ** з бягучымі с.-г. кампаніямі. Да «дня калектывізацыі і ўраджаю» калгаснікі с.-г. арцелі «Чырвоная Полаччына» прышлі з баявым балянсам сваёй барацьбы з кулацтвам за будаўніцтва аграмаджанае гаспадаркі.

За 8 месяцаў калгас **ВЫРАС НА 900 ПРОЦ.** Зараз калгас зяблівae **99** гаспадарак. Плошча калгасу павялічылася больш чым **У 8 РАЗ** і дасягнула **1.352** гэктараў. Калгас, **СКОНЧЫЎШЫ** ў асноўным асеньнюю с.-г. кампанію, пераключыўся па дапамогу адзінаасобнікам. «Чырвоная Полаччына» **ўзяла на буксір суседнюю вёску Вярхоўе,** якая адстае ў асеньняй сяўбе. Сіламі калгаснікаў там **арганізавана таварыства па супольнай апрацоўцы зямлі.**

Загатоўкі арцель праводзіць баявым ударным тэмпам. Заданьне па ўсіх культурах **ЗНАЧНА ПЕРАВЫШАНА.** Загатоўчы плян па аўсу калгас ужо выканаў па **600 ПРОЦ.**; па ячмені — на **166,5 ПРОЦ.**; па бульбе — на **145 ПРОЦ** і г. д. Калгас здаў звыш пляну вагон яблык. Выканаўшы заданьне па загатоўцы бульбы на **145 ПРОЦ.**, калгаснікі дадаткова здаюць дзяржаве **8 ТОН.** Плян кантрактацыі ільну **ВЫКАНАНЫ ПОЎНАСЬЦЮ.**

Зараз у калгасе арганізавана партыйная ячэйка і работа пайшла **яшчэ больш хуткім тэмпам. КАЛГАС РАСЬЦЕ І МАЦНЕЕ.** Калгас заслугоўвае быць адзначаным, як адзін з **УДАРНЫХ КАЛГАСАЎ, ПЕРАДАВІКОЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ЗЯМЛЯРОБСТВА.**

295 і 887

КОЙДАНАВА, 19 КАСТРЫЧНІКА.

Калгас **«ЗЬВЯЗДА»**, Койданаўскага раёну да «дня калектывізацыі і ўраджаю» з посьпехам скончыў асеньнюю с.-г. кампанію. Плян сяўбы азімых выкананы на 120 проц. Свячасова скончана ўборка ўсіх культур. Адным з першых у раёне калгас «Зьвязда» выканаў поўнасьцю заданьне па збожжазагатоўках. На гэтым калгаснікі не супаколіся і зараз яны ўзмоцнена фарсуюць абмалот, каб здаць дзяржаве свае збожжавыя пішкі. Калгас праводзіць значную работу па мабілізацыі сродкаў. Пазыка «Пяцігодка—за чатыры гады» рэалізавана на 172 проц., поўнасьцю пакрыты ўсе страхавыя плацяжы. Плян сілаваньня кармоў выкананы цалкам.

Разьмеркаваўшы свае прыбыткі і ўраджай, калгас добра паказаў суседзям адзінаасобнікам вялікую перавагу калектыўнай працы. «Зьвязда» зьяўляецца невялікім калгасам. Арцель яднае 25 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і 4 батракоў-адзіночак. Аднак, толькі зд аднаго паляводзтва ў гэтым годе калгас мае 14.900 руб. прыбытку. Ужо ў першым годзе свайго існаваньня, яднаючы толькі 25 процантаў гаспадарак вёскі Кукшэйчы, калгас «Зьвязда», поўнасьцю забясьпечваючы сябе збожжам, здае дзяржаве значна больш збожжавых пішкаў, чым уся вёска. Калгаснікі атрымліваюць у калгасе значна большы прыбытак, чым яны мелі раней ад сваіх адзінаасобных гаспадарак. Вось яскравы прыклад. Сям'я бедняка МАЙСАКА да ўступленьня ў калгас мела ад сваёй адзінаасобнай гаспадаркі 295 руб. прыбытку, а зараз у калгасе яна мае 887 руб. чыстага прыбытку. Калгаснік БУРС да ўступленьня ў калгас меў 385 руб. прыбытку, а зараз у калгасе ён атрымлівае 609 руб.

Посьпехі калгасу «Зьвязда» зьяўляюцца лепшай зарукай яго далейшага росту за лік вакольных адзінаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў.

ІВ.

Зводка НКЗ БССР

АБ ХОДЗЕ ЗЯБЛІВА НА 15 КАСТРЫЧНІКА.

СЭКТАРЫ	Плянавае заданьне ў тысячах га	Выкавана на 15 X у процантах	Было на 10 X
Саўгасы	24.000	38,4	34,5
Калгасы	242.600	12,5	9,8
Інд. сэктар	768.900	32,4	28,4
РАЗАМ . .		27,6	24

БЮЛЕТЭНЬ № 12

Тэмпы зяблівa на сёнешні дзень зьяўляецца **зусім нездавальняючымі.** На 15 кастрычніка рэспубліканскае заданьне па зяблівe выкананa ўсяго на **27,6 проц.** Параўнальна з мінулай пяцідзеўкай выкананьне пляну павялічылася толькі па **3,6 проц.**, што зьяўляецца **зусім невыстарчальным.** Калгасы, выканаўшы па 10 кастрычніка плян зяблівa на 9,8 проц., па 15 кастрычніка дабіліся ўсяго 12,5 проц. пляну. Саўгасы ўзаралі пад зяб 38,4 проц. заданьня (па 10 кастрычніка было 31,5 проц. пляну). Індывідуальны сэктар выканаў плян зяблівa на 32,4 проц. Мясцовыя арганізацыі, як правіла, яшчэ не аддаюць зяблівy патрэбнай увагі. У радзе раёнаў мае месца недапушчальная недаацэнка і ігнараваньне зяблівaга ворыва.

Становішча ўкамплектаваньня саўгасаў трэсту «Сьвінавод» характарызуецца наступнымі данымі: яшчэ да 1 кастрычніка ў саўгасах трэба было паставіць 20.000 сьвінаматак. Аднак, на сёнешні дзень плян укамплектаваньня выкананы ўсяго на 45 проц. (паставлена 9.000 сьвінаматак). Будаўніцтва сьвінарнікаў разгорнута дрэнна. Будаўнічая праграма да гэтага часу **ня выканана.**

Сьвінарнік вырашае праграму сьвінагадоўлі

ПАГРОЗА ЗРЫВУ БУДАЎНІЦТВА У САЎГАСАХ „СЬВІНАВОДУ" **не ліквідавана**

УБРАЦЬ БАР'ЕРЫ СА ШЛЯХУ РАЗЬВІЦЬЦЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ МЯСНЫХ ФАБРЫК

Лесаматар'ялы ёсьць

ТРЭБА ІХ ТОЛЬКІ ПАДВЕЗЬЦІ ДА САЎГАСАЎ

Будаўніцтва сьвінарнікаў у саўгасах трэсту «Сьвінавод» ідзе чарапашымі тэмпамі. Паводле пляну да 1-га кастрычніка бягучага году павінна было быць пабудавана—20.000 матачных месц і 37.000 адкормачных. На сёнешні дзень пабудавана толькі 908 матачных месц. (4,5 проц.) і 600 адкормачных (1,6 проц.).

Пакуль што становішча некалькі выратоўвае тое, што для атрыманых сьвінаматак прыстасавана 4.980 матачных месц і 539 адкормачных у старых памяшканьнях. Але-ж гэтае мерапрыемства—часовае і ня можа ні ў якім разе задаволіць патрэбнасьць саўгасаў у сьвінарніках.

Асноўнай прычынай зрыву будаўніцтва зьяўляецца адсутнасьць на мясцох патрэбных матар'ялаў. Характэрна, што гэтыя матар'ялы адпушчаны, але знаходзяцца на станцыях чыгункі. **Мясцовыя арганізацыі ня здольны нападзіць свячасовую і рэгулярную даставку гэтых матар'ялаў на месца будаўніцтва.** Вось факты.

У саўгасе **Віленсінча** (Пухавіцкі раён) будуюцца два матачнікі. Рабочыя-будаўнікі, улічваючы важнасьць работы, абвясьцілі сябе ўдарнымі да выклікалі адзін другога на сацыялістычнае спаборніцтва. Але ініцыятыва рабочых не выкарыстоўваецца мясцовымі арганізацыямі. Замест таго, каб ужыць рашучыя меры для рэгулярнага забясьпечэньня будаўніцтва матар'ялямі, мясцовыя арганізацыі дапускаюць прастоі. Матар'ялы ляжаць за 15-20 кілёметраў ад саўгасаў і няма каму прыцягці іх на месца.

У саўгасе **«Вішнёўка»** (Астрашыцка-Гарадзецкі раён) будуецца 6 сьвінарнікаў на 600 сьвіна-месц. Увесь час кіраўнікі саўгасу крычалі аб недахвацe будаўнічых матар'ялаў—гонтаў і жалезa. **А зараз гэтыя матар'ялы ляжаць на станцыі Менск ужо больш тыдню і не забіраюцца саўгасам.** Пастанова СНК аб працоўна-гужавой павінасьці на мясцох слаба выконваецца.

Зрыў будаўніцтва сьвінарнікаў прыводзіць да зрыву ўкамплектаваньня саўгасаў сьвінаматкамі. Патрэбны тэрміновыя меры.

С.

Камунарка даглядае сьвіней (камуна «Сайбіт», Вузьдзенскі раён)

Белсельтрэст упарта ігнаруе дырэктыву ўраду

Забраць цялят з саўгасаў „Сьвінаводу"

Плян укамплектаваньня саўгасаў трэсту «Сьвінавод» сьвінаматкамі зрываецца. Ня гледзячы на пікатайкія дырэктывы ўраду і сыгналы друку беларускія арганізацыі вельмі мала робяць для ўзмацненьня ходу ўкамплектаваньня.

Яшчэ да 1-га кастрычніка, саўгасам павінна было быць перадана **20.000 сьвінаматак.** Прайшло ўжо каля 3-х тыдняў, а плян укамплектаваньня не выкананы яшчэ нават і напалову. У саўгасах ёсьць ёсяго 9.000 сьвінаматак, што складае 45 проц. пляну.

Бюмяса павінна паставіць саўгасам трэсту «Сьвінавод» 5.000 сьвінаматак. Але прыёмка гэтых сьвіней саўгасамі ідзе надзвычай марудна, галоўным чынам, з-за адсутнасьці патрэбнай колькасьці сьвінарнікаў. Будаўніцтва апошніх паставлена з рук вон дрэнна.

У радзе саўгасаў ёсьць шмат цялят, якія павінны, паводле пастановы Экана, быць перададзены Белсельтрэсту. Усяго Белсельтрэст павінен прыняць ад саўгасаў трэсту «Сьвінавод»—1500 цялят. Гэтае мерапрыемства даво-б магчымасьць прыстасаваць яшчэ 2.000 месц для сьвінаматак.

Аднак, Белсельтрэст упарта ігнаруе гэтую дырэктыву Экана і ня прымае цялят. Кожны дзень Белканцтора трэсту «Сьвінавод» атрымлівае тэлеграмы ад розных саўгасаў, якія патрабуюць хутчэйшага прыняцьця лішкаў цялят.

Саўгасы **«Мсьціж»** (Бягомльскі раён), **«Лагаза»** (Лагойскі раён), **«Палелюм»** (Барысаўскі раён), **«Новыя Залёнкі»** (Чэрвеньскі раён), **Луцушчына** (Лагойскі раён), **Некрашы** (Слуцкі раён) і інш. тэлеграфуюць: «зможам поўнасьцю выканаць плян укамплектаваньня, калі будуць прыняты лішкі цялят».

Трэба ўжыць рашучыя меры для ўзмацненьня ходу ўкамплектаваньня сьвінаматак. Моцна ударыць па тых, хто зрывае гэтую важнейшую работу.

С. Г.

Сьвіньні галадаюць

Забясьпячэньне саўгасаў трэсту «Сьвінавод» моцнымі кармамі пастаўлена вельмі дрэнна. Кантора «Саюзхлеба» адносіцца да гэтай работы нядбайна. Нарады ня выконваюцца на працягу паўтара-двух месяцаў. Часта «Саюзхлеб» пасылае нарады ў тыя пункты, якія ня маюць у наяўнасьці патрэбнай колькасьці кармоў. Падамо некалькі фактаў.

Саўгас **«Бачэйкава»** (Бешанковіцкі раён) тэлеграфуе Белканторы «Сьвінавод»: «Лепельскі пункт Саюзхлеба ня мае магчымасьці выканаць нарадаў на авёс. У саўгасе адчуваецца недахват кармоў».

Другі факт. 5,7 тоны ячменю, вызначаных для **саўгасу «Горкі—Абчак»** па жнівень, не прыйшлі саўгасам яшчэ і да гэтага часу.

Трэці факт: саўгас **«Насовічы»** (Томельскі раён) тэлеграфуе: «тэрмінова дасылайце корм, сьвіньні галадаюць. Жнівеньскі і верасьнеўскі нарады не атрыманы».

Такое становішча з забясьпячэньнем саўгасаў кармамі нікуды пяварта. Белканторы «Сьвінавод» і «Саюзхлеба» трэба прыняць тэрміновыя меры для наладжаньня гэтай справы.

С.

Пад кантроль РСІ

Усім раённым КК РСІ

У радзе раёнаў уборка, загатоўка і адгрузка бульбы ідзе вельмі марудна. Ёсьць выпадкі, калі раённыя арганізацыі самастойна скарачаюць пляны загатоўкі бульбы. Прэміяльныя фонды, вызначаныя для прэміраваньня за ўборку і загатоўку бульбы, часта скарыстоўваюцца райсаюзамі няправільна, прэміруюцца толькі здатчыкі бульбы.

На мясцох часта няма поўных указаньняў адносна пунктаў адгрузкі. Гэта выклікае прастоі вагонаў. Баржы і вагоны падаюцца ў непадрыхтаваныя для пагрузкі выгляздзе. Загатоўка другіх гатункаў гародніны ідзе недапушчальна слаба.

ЦКК КП(б)Б прапануе ўсім раённым КК-РСІ тэрмінова прыступіць да праверкі заданьняў па загатоўцы гародніны і ўжыць захады да ўзмацненьня тэмпаў загатовак. Трэба прыцягваць да судовай адказнасьці асоб, якія нядбайна адносяцца да загатоўкі гародніны.

Загатоўка гародніны зьяўляецца зараз адной з важнейшых задач. Таму раённыя КК-РСІ павінны тэрмінова разгарнуць гэту работу.

Старшыня ЦКК КП(б)Б

КАЛНІН.

НЕ ПАСЛАБЛЯЦЬ УБОРКІ І АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ!

Любаньскі, Коханаўскі і Лагойскі раёны ганебна адстаюць

ЧЫГУНАЧНІКІ І ВОДНІКІ, ЗАБЯСЬПЕЧЦЕ БЕСЬПЕРАБОЙНУЮ АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ ПРАЛЕТАРСКІМ ЦЭНТРАМ

75.000 пуд. бульбы на прыстанях

Таварышы, якія прыехалі з месц, расказваюць аб агіднейшай рабоце чыгункі і водзянога транспарту пры падачы вагонаў і барж для пагрузкі бульбы.

Асабліва дрэннае становішча з адгрузкай бульбы па водзяных шляхох. У Бешанковічах ля прыстані згрудзілася звыш 15.000 ПУД. бульбы, якая ня вывозіцца з-за адсутнасьці барж. У Прапойску, на прыстанях Дзяржпараходзтва, усё яшчэ ляжыць звыш 50.000 ПУД. бульбы. У КРЫЧАВЕ больш тыдня ляжыць звыш 30.000 ПУД. бульбы, адгрузка якой тармозіцца з-за адсутнасьці перавозачных сродкаў.

Грамадзкасьць чыгункі і водзянкі яшчэ не ўцягнуты ў кантроль над выкананьнем адміністрацыяй плянаў падачы вагонаў і барж для перавозкі бульбы.

Чыгунка і водзяны транспарт павінны забясьпечыць бесьперабойную падачу вагонаў для адгрузкі бульбы ў пралетарскія цэнтры Саюзу.

УБІРАЮЦЬ ГАРОДНІНУ

Вучні 27-й школы на палёх саўгасу імя «Лекерта»

125 вагонаў замест 400

Належнага пералому ў загатоўках і адгрузцы бульбы яшчэ няма. Адгрузка праходзіць, як і раней, злачынна-марудна. За 15 дзён кастрычніка адгружана ўсяго **37.361 тона.** Гэта значыць, што замест патрэбных штодзённа 400 вагонаў, адгружаецца толькі 125.

На мясцох ня здолелі ўвязаць кампанію капаньня бульбы з вывазкай яе. **У радзе раёнаў бульба ляжыць у полі.** Гужпавінасьць у жыцьцё не праводзіцца.

Слабы ход загатовак і адгрузкі бульбы тлумачыцца выключна бязьдзейнасьцю раённых работнікаў. У тых раёнах, дзе мабілізавана грамадзкасьць, дзе камсамол ды інш. арганізацыі удзельнічаюць у загатоўках, пляны перавыкананы. Так, **Дрыбінскае райспажывецкае** таварыства выканала сваё заданьне **на 120,6 проц. Дрысенскае — на 115 проц., Камарынскае — 128 проц., Лепельскае — 129,3 проц., Халопеніцкае — 111 проц.** і г. д.

У той-жа час мы маем рад раёнаў, дзе загатоўкі бульбы яшчэ не распачаты. **Любаньскі раён выканаў сваё заданьне на 1,4 проц., Лагойскі — 6,1 проц., Коханаўскі — 4,7 проц.** і г. д.

Яшчэ горш выконваюць свае заданьні па загатоўках Райкаапсаюз.

На мясцох амаль нічога ня зроблена для спагнаньня бульбы па цьвёрдых заданьнях, даных кулаку. У Бешанковіцкім раёне з 12 сельсаветаў толькі ў 6-ці выяўлены кулакі, якім даны цьвёрдыя заданьні. На 15-га кастрычніка па раёне паступіла толькі 30 проц. бульбы па цьвёрдых заданьнях.

Дырэктыва ўраду аб прэміраваньні здатчыкаў бульбы да гэтага часу не даведзена да шырокіх мас сялянства.

Паміж загатоўшчыкамі няма адзінага пляну прыёмкі і адгрузкі бульбы. Загатоўчыя арганізацыі не падрыхтаваны да прыёмкі вялікіх грузаў. Так, у Прапойску пры пагрузцы бульбы на тры баржы, мелася толькі адна вага, што значна затрымала пагрузку.

Такія тэмпы адгрузкі бульбы ставяць пад пагрозу выкананьне пляну. Дні, якія засталіся, павінны быць скарыстаны для максымальнага ўзмацненьня адгрузкі.

Уся ўвага грамадзкасьці, усе мабілізаваныя таварышы, якія былі пакіраваны для ўзмацненьня капаньня бульбы, павінны дабіцца 100 проц. выкананьня пляну загатовак і адгрузкі бульбы

УЗМОЦНІМ ФІНАНСАВУЮ БАЗУ ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

СТРАХОУКА З КУЛАКОУ ЯШЧЭ НЕ СПАГНАНА

БІЦЬ ПА САМАЦЁЧНАЙ ПРАКТЫЦЫ У РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ

Па БССР рэалізавана 12.500 тыс. руб.

Паводле вестак НКФ БССР па 10 кастрычніка па БССР падпіска па пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» дасягнула 12.500 тысяч руб., або 84,4 проц. заданьня.

Па групе рабочых і служачых рэалізавана 10.295.000 рублёў—93,6 проц. заданьня. Па сялянскім сэктары заданьне выканана на 58,5 проц.; сярод неарганізаванага насельніцтва—на 56,4 проц.

Афармлена 9.025.400 рублёў, або 72,3 проц. папярэдняй падпіскі.

Лепш за ўсіх выканалі заданьні Плешчаніцкі раён — 172,4 проц., Слуцкі — 135,6 проц. Плятуцца ў хвасьце — Церахоўскі раён — 41,8 проц. і Чачэрскі — 57 проц.

Ад многіх раёнаў ужо больш месяца няма ніякіх вестак.

Па афармленьні падпіскі на першым месцы ідуць **Азарыцкі і Астрашыцка-Гарадзецкі раёны** (афармлены ўсе 100 проц. папярэдняе падпіскі).

З буйных гарадоў БССР лепш за ўсіх выканаў заданьне г. **Ворша** —119,4 проц. Горш за ўсіх — **Мазыр**—58,8 проц.

Верасьнёўскі прарыў не ліквідаваны

Даныя аб зборы страхоўкі ў 10 кастрычніка 1930 г. сьведчаць аб тым, што верасьнёўскі прарыў яшчэ не ліквідаваны. Паступіла толькі 4.200.000 руб., або 40,2 проц. гадавога заданьня.

Такі тэмп паступленьня страхоўкі тварае пагрозу невыкананьня кастрычніцкага заданьня.

Толькі 24 раёны БССР перавыканалі верасьнёўскае заданьне. З гэтых раёнаў лепш за ўсіх збор ідзе ў **Клічаўскім**—[illegible] проц., **Сіроцінскім**—64,6, **Каралінскім** —61,3 проц., **Расьнянскім**—61,6 проц. [illegible]

Нізка адстаюць у зборы страхоўкі [illegible]ршанскі, **Дрыбінскі, Бялыніцкі і** [illegible]евейскі раёны, якія не сабралі і 20 [illegible] ад закладу. Па **Глускім** раёне паступіла ўсяго 6,3 проц. страхоўкі.

Недапушчальна марудна праходзіць спагнаньне страхоўкі з кулацкіх гаспадарак. Так, у **Астрашыцка-Гарадзецкім** раёне ад кулацкіх гаспадарак паступіла 17,4 проц. страхоўкі, па **Халопеніцкім**—2,3 проц.; у **Рэчыцкім** раёне нічога не [illegible]; па **Пухавіцкім раёне** з налічаных на кулакоў 1.181 руб. 34 кап. не паступіла ні адной капейкі і г. д.

На многіх раёнах кулацкія гаспадаркі нават ня ўзяты на асобны вучот і самі райвыканкомы ня ведаюць аб разьмеры запазычанасьці страхоўкі за кулакамі.

На калгасах замест 750.000 руб. паступіла 45.000 руб.

Яшчэ ня ўся маемасьць калгасаў застрахавана, праўленьні іх праяўляюць у гэтай справе поўную бязьдзейнасьць.

Апошнія дзьве дэкады кастрычніка павінны даць ня менш чатырох з паловай мільёнаў рублёў. Збор страхоўкі ў кожным раёне павінен быць даведзены да 85 проц. гадавога заданьня. Гэта работа патрабуе ўдарных тэмпаў, а ня стаўкі на самацёк.

Трэба рашуча ўдарыць па тых, хто патурае кулаку і не спаганяе з кулацкіх гаспадарак страхавых плацяжоў.

Калгасы павінны стаць прыкладам на ўзносе страхоўкі. Да 1-га лістапада калгасы павінны поўнасьцю аплаціць страхоўку.

Ц. П.

Ударных тэмпаў у рэалізацыі пазыкі яшчэ няма

Апошняя дэкада амаль не дала зруху ў рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады».

Так, па групе рабочых і служачых прырост выканаўшых кантрольнай лічбы даў толькі 2,8 проц., сяляцтва—5,3 проц., па групе неарганізаванага насельніцтва—4,1 проц. і па агульнай суме—3,3 проц.

Кантрольная лічба яшчэ недавыканана на ўсіх групах насельніцтва, прычым асабліва адстае ў рэалізацыі пазыкі сяляцтва і неарганізаванае насельніцтва.

Тэмпы кампаніі ў апошні час недастаткова марудныя.

Рад раёнаў сыстэматычна не прадстаўляе вестак аб ходзе кампаніі, што трэба разглядаць як спробы прыкрыць сваю **бязьдзейнасьць.**

На 10 кастрычніка ня былі прадстаўлены весткі па 42 раёнах БССР. Маўчаць, галоўным чынам, тыя раёны, якія адстаюць у рэалізацыі пазыкі і наогул ад ударных тэмпаў работы.

Вось сьпіс раёнаў, якія зрываюць фінплян і мабілізацыю сродкаў насельніцтва:

Пухавіцкі, Сіроцінскі, Сураскі, Высачанскі, Вушацкі, Гомельскі і Церахаўскі.

Самацёк у кампаніі па рэалізацыі пазыкі павінен быць зьнішчаны. Самацёчная практыка — гэта дапамога кулаку. Бліжэйшыя дні павінны даць у справе распаўсюджваньня пазыкі рашучы пералом.

А. ЛЬВОЎ.

ДОБРЫ ПАЧЫН

Работнікі ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАГА СЛУЦКАГА раённых крэдытных таварыстваў заключылі сацдагавор на лепшае выкананьне заданьняў па мабілізацыі сродкаў.

Работнікі абодвух таварыстваў абавязаліся:

— САБРАЦЬ ЦАЛКАМ І Ў ТЭРМІН УСЕ ПЛАЦЯЖЫ ПА ПАЗЫКАХ.

— ПРЫНЯЦЬ УСЕ МЕРЫ ДА ЗБОРУ ПАЕЎ З ЧЛЕНАЎ КАЛГАСАЎ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ГАСПАДАРАК; ЦАЛКАМ ВЫКАНАЦЬ КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ ПА ПАЯНАКАПЛЕНЬНІ.

— ШЫРОКА ПАПУЛЯРЫЗАВАЦЬ ЗАДАЧЫ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ СЯРОД ГРУП БЕДНАТЫ І МЯСЦОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

— Поўнасьцю выканаць заданьне па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» і трактарных абавязацельствах.

Датэрміновыя перавыбары праўленьня МЦРК

У сувязі з цэлым радам прарываў у рабоце МЦРК, аб якіх у свой час паведамляў друк (прарыў на фронце гародніны, прарыў па паянакапленьні, маруднасьць у разгортваньні прыгарадных гаспадарак, слабая дзейнасьць каапэрацыйнага актыву, заціск самакрытыкі ў апараце і інш.) адпаведнымі органамі прынята пастанова аб датэрміновых перавыбарах праўленьня і каапэрацыйнага актыву.

Тэрмін для правядзеньня датэрміновых перавыбараў каапэрацыйнага актыву ўстаноўлен да 15 лістапада, а на вытворчых калектывах кампанія павінна закончыцца да 1 лістапада. Для кіраўніцтва датэрміновымі перавыбарамі створана выбарчая камісія ў складзе прадстаўнікоў райкомаў, БКС, ЦСПСБ і друку. Па пляне вызначана правесьці 200 сходаў. У калектывах, якія маюць у сваім складзе 100 і больш пайнікаў, сходы будуць праводзіцца непасрэдна на прадпрыемствах, калектывы-ж з меншай колькасьцю пайнікаў для выбараў па ўказаньні ЦП саюзаў павінны аб'яднацца. Каб ахапіць большую колькасьць пайнікаў вызначана па прадпрыемствах са зьменнай работай сходы праводзіць пазьмення і па цэхах.

Інстытут упаўнаважаных, згодна пастановы 2-га зьезду спажывецкай каапэрацыі, ліквідуецца. Замест сходаў упаўнаважаных каапэрацыйныя пытаньні будуць вырашаць каапэрацыйныя зьезды і канфэрэнцыі. Таму на перавыбарчых сходах павінны быць абраны дэлегаты на 8-мы каапзьезд ЦРК (для выбараў праўленьня і рэўкамісіі), і дэлегаты—на каапканфэрэнцыю для выбараў райбюро. Модус у абодвух выпадках—адзін дэлегат ад 100 пайнікаў.

Ва ўсіх калектывах, якія маюць 100 і больш пайнікаў, будуць выбірацца каапбюро ў складзе ад 5 да 9 чал. У калектывах з такой-жа колькасьцю пайнікаў павінны быць выбраны крамныя камісіі выключна для работы ў прымацаваных крамах з 5 чал. Для нагляду і дапамогі ў рабоце сталовак па вытворчых калектывах павінны быць выбраны сталовыя камісіі з 5 членаў. Для каапработы ў цэхах ствараюцца цэхавыя каапбюро. Усе-ж дробныя калектывы, якія ня маюць 100 пайнікаў, абслугоўваюцца па-ранейшаму каапрагнізатарамі, па адным на калектыў.

Для правядзеньня перавыбараў і ў якасьці дакладчыкаў вызначана 86 упаўнаважаных па перавыбарах, якія прымацоўваюцца да пэўных калектываў і роўна з партыйнымі і прафесыянальнымі ячэйкамі зьяўляюцца адказнымі за стан перавыбараў у даных калектывах.

Улічваючы вялізарную важнасьць патрабаваньняў, пастаўленых перад каапэрацыяй, а таксама і тую акалічнасьць, што цэрабкоп з усімі пастаўленымі задачамі можа справіцца толькі пры ўмове бязупыннага масавага рабочага кантролю за яго работай (бо ад падбору каапактыву і яго працаздольнасьці ў большай ступені залежыць паляпшэньне ў забесьпячэньні рабочых і зьнішчэньне ўсіх недахопаў, меўшых месца за апошні час у рабоце ЦРК), партыйныя ячэйкі і прафесыянальныя арганізацыі надыходзячым датэрміновым перавыбарам павінны надаць выключнае значэньне. З арганізацыйнага боку гэтыя сходы павінны быць максімальна масавымі і праводзіцца пад асноўнымі лёзунгамі—100 проц. наведваньне сходаў пайнікамі, дасканалы падбор каапактыву і найшырэйшая крытыка «не зважаючы на асобы».

Ф—в.

МЕНСК

Масавая праверка калдагаворнай кампаніі

Увесь кіруючы склад ЦСПСБ і многія работнікі ЦП саюзаў мабілізаваны для праверкі ходу калдагаворнай кампаніі і збору рабочых прапаноў да калдагаворнай кампаніі. Праверкай будзе ахоплена 20 менскіх прадпрыемстваў.

18 адказных работнікаў ЦП саюзаў пасланы на пэрыферыю.

Выгружана толькі 52 проц. лесаматар'ялаў

Паводле апошніх вестак, пушчана ў сплаў 2.955.000 км. лесаматар'ялаў і дроў, ці 100,54 проц. пляну. Значна горш з выгрузкай. **Заданьне па выгрузцы выканана ўсяго на 52 проц.**

Асабліва дрэнна праходзіць выгрузка драўніны ў Гомелі і ў Мазыры.

Для перавозкі ў Гомель з прыстаней 43.000 кбм. дроў Дзяржпараходства прызначыла толькі 6 барж., што не забясьпечвае магчымасьці перавозкі такой колькасьці дроў. Такое-ж становішча ў Мазыры.

На сплаўных работах на сёнешні дзень не хапае 3.000 рабочых.

Патрэбна мабілізацыя ўсіх сіл для паскарэньня тэмпаў выгрузкі драўніны з вады.

Новы турбагенэратар на Менскай электрастанцыі

На менскай гарадзкой электрастанцыі канчаецца пабудова новай капельнай. Работа вядзецца ударным тэмпам з тым, каб скончыць яе да 20 лістапада. Створана 6 ударных брыгад. Устаноўка новага турбагенэратара — павялічыць магутнасьць станцыі да 6.500 кілёват. Пуск турбагенэратара прыстасоўваецца да Кастрычніцкага сьвята. Пашырэньне магутнасьці станцыі дасьць магчымасьць уключыць ня менш 1.000 новых абанентаў.

Адкрылася канфэрэнцыя ўдарнікаў Фрунзаўскага раёну

Учора, а 7 гадз. увечары адкрылася канфэрэнцыя ўдарнікаў Фрунзаўскага раёну. Прысутнічае 450 дэлегатаў. Канфэрэнцыя заслухала даклад старшыні ВСНГБ, т. Грысевіча, аб выкананьні прамфінпляну другога году пяцігодкі прамысловасьцю БССР і садаклады дырэктароў заводу «Камунар», фабрыкі «Кастрычнік», зав. «Дрэвапрадоўшчык» і друкарні імя Сталіна. Канфэрэнцыя працягнецца некалькі дзён.

У часе работы канфэрэнцыі ў прэзыдыум паданы заявы 27 кваліфікаваных рабочых заводу «Камунар», вытворчы стаж якіх ад 5 да 40 гадоў, аб прыёме ў партыю. Аналёгічныя заявы паступілі ад групы рабочых і камсамольцаў фабрыкі «Кастрычнік». Усяго падана 53 заявы.

Пленум Менскага гарсавету

18 кастрычніка адбыўся чарговы пленум Менскага Гарсавету, на якім быў заслуханы даклад МЦРК аб рабочым забесьпячэньні.

Даклад выклікаў ажыўленыя спрэчкі. Выказаўся рад членаў савету, якія паказвалі на буйныя недахопы ў рабоце МЦРК. ЦРК дагэтуль працуе бясплянова. Вялікія прарывы ёсьць у загатоўках гародніны і садавіны. Колькасьць сталовак значна павялічылася, але якасьць абедаў усё яшчэ застаецца дрэннай.

На гэтым-жа пленуме выбраны членамі прэзыдыуму Гарсавету—т. т. **Пятушкоў, Шпэктараў, Казакевіч, Эльперын і Асаёнак.**

Новы дом на 76 кватэр

На Маскоўскай вул. канчаецца пабудова новага дому камгасу на 76 кватэр. Частка кватэр будзе замацавана за навуковымі працаўнікамі.

Каапэрацыйныя галавацяпы зрываюць падрыхтоўку кадраў

Праклятая спадчына

Ня будзем шмат казаць аб тым, што ўяўляў сабой Беліцкі сельска-гаспадарчы тэхнікум да верасьня г. г.

Перакопы недахватаў, бяздоньні голаду і холаду, сьцены фармалізму і схалястыкі прыходзілася штурмаваць гэрачтным выхаванцам...

Варта толькі зазначыць, што ў верасьні перад новым дырэктарам ва ўсёй яскравасьці паўстала пытаньне стварэньня чалавечых умоў для жыцьця і вучобы студэнтаў.

Адразу-ж дырэктар катэгарычна запатрабаваў паставіць на належную выпішку забесьпячэньне студэнтаў прадуктамі першай неабходнасьці.

І каапэрацыйная арганізацыя, і райком КП(б)Б шчыра і пераканаўча запэўнілі:

— Мы дапаможам... Ніякіх зрываў у вас больш ня будзе! Не бядуйце!

Студэнты ў полі

10 кастрычніка ўцёпаны і абпадзесены тэхнікум абвясьціў сябе мабілізаваным на ўборачную кампанію.

У поўнай сьвядомасьці маральнага абавязку і адказнасьці за ўборку студэнты, як адзін, выйшлі ў поле...

15 упартых дзён бесьперапынна, зранку да вечара, аддана працавалі студэнты на калгасных абшарах.

У выніку: рукамі студэнтаў у 5-ці калгасах зроблены сіласныя ямы і закладзена на 100 тон масы ў кожную з іх; выбрана да 60 га ільну; выкапана каля 10 га бульбы; закладзена сіласная вежа.

І на сёнешні дзень фарты ня здаедзены: тэхнікум яшчэ мае ўбраць некалькі га бульбы ў саўгасе.

Кампэнсацыя—нуль...

За час работы студэнты падралі свой абутак, адзеньне. Папаўзьлі скаргі...

І тут сталі надаючны ягадкі квяцістых абяцаньняў. Усе спробы дырэктара дамагчыся чаго-небудзь для студэнцтва разьбіліся ўшчэнт.

— Няма, бачыце... Уласна кажучы тут ня наша справа, не дае Белкаапсаюз!..

Цяпер кожны дзень нясе пагоршаньне. Каапэрацыя не дае прадуктаў. Тэхнікум не забясьпечаны нават расьлінымі тлушчамі, крупамі, хлебам.

Надоечы загадчык сталоўкі зганяў па тэлефону ў Сянно:

— Няма чаго варыць... Шлеце хутчэй прадукты!

І мудрыя работнічкі з раёну ў адказ далі параду:

— Зачыні сталоўку!

168 студэнтаў літаральна галадаюць. Цьмянай хмараю павіс адліў. На сёньня самавольна кінулі тэхнікум 10 асоб, з іх 5 — камсамольцаў...

Выньце вату з вушэй!

Трывожныя сігналы не даходзяць ні да Сеньненскага спажывецкага таварыства, ні да Белкаапсаюзу.

Паперкі нібы гублюцца ў дарозе.

Становішча сур'ёзнае. Трэба захаваць тэхнікум. Трэба неадкладна ўдарыць па пятапіне і нядбайнасьці каапэрацыйных органаў.

Цьвярдыні бюракратызму і коснасьці павінны быць разьбіты!

Юр. ЛЯВОННЫ.

Няма часу гэтым займацца

У Рагачоўскім райкалгассаюзе ўлік рабсельскораўскіх заметак павінен весьці сакратар. Аднак, гэты сакратар нават ня ведае, колькі заметак паступіла і дзе яны знаходзяцца. Аб рэагаваньні на іх і ня думае. Толькі вядома, што заметкі перадаваліся для правядзеньня расьсьледваньня інструктарам Сідарэнку і Ханькову, аб далейшым лёсе заметак ніхто ня ведае.

— Няма часу зараз гэтым займацца. —так адказаў Сідарэнка сакратару на патрабаваньне хутчэй скончыць расьсьледваньне.

Сідарэнка і Ханькоў штодзенна бываюць у калгасах, займаюцца рознымі справамі, толькі не расьсьледваньнем заметак.

Бязьдзейнасьць Сідарэнкі і Ханькова ператварылася на сутнасьці ў запіскі самакрытыкі.

Вінаватых у гэтых нядбайных адносінах да рабсельскораўскіх заметак трэба прыцягнуць да адказнасьці.

Н.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ:

— Культпроп Фрунз. РК. КП(б)Б. А 7 гадз. увечары ў залі пасяджэньняў Фрунз. РК адбудзецца нарада ўсіх выкладчыкаў саўпартшколы, па пытаньні: разбор праграмы, зацьвярджэньне прадметных камісій. Яўка ўсіх выкладчыкаў к вызначанаму часу абавязкова.

— БАН. А 3 гадз. дня, у памяшк. Кампузу (3-ці паверх, пак. 9) адбудуцца заняткі асьпірантаў па ангельскай мове малодш. групы.

— Урачысты вечар, прысьвечаны выпуску эканамістых-бухгальтароў, скончыўшых вышэйшыя эканамічныя курсы пры факультэце наргасу БДУ, адбудзецца сёньня, а 8 гадз. увечары, у БДУ, гал. корпус, 3-ці паверх, аўд. № 317 (уваход з Савецкай вул.). Запрашаюцца рахункова-эканам. працаўнікі.

— Пэдгабінэт. У 19 гадз.—сход настаўнікаў вячэрніх школ па пытаньні палітэхнізацыі школ.

ЗАЎТРА:

— Кастрычніцкі РК ЛКСМБ, сумесна з бюро фізкультуры ЦП саюзу гарбароў Бел., склікае 21 кастрычніка, а 6½ гадз. увеч., у памяшк. Дому Камсамолу (Камсамольская, 25), нараду камсамольцаў-фізкультурнікаў, вайсковы-фізкультурных сэктараў, сакратароў пэх. ячэек і калектываў ЛКСМБ усіх прадпрыемстваў саюзу гарбароў гор. Менску. Адказнасьць за яўку ўсіх т. т. ускладаецца на сакратароў ячэек ЛКСМБ.

— БДУ. А 6 гадз. увеч., у гал. корп., аўд. 302. адбудзецца аб'яднаны адкрытты партсход яч. сац.-гіст. і літ. аддз. пэдфаку. Парадак дня: 1) Справаздача бюро партколектыву пэдфаку. 2) Справаздача бюро сац.-гіст. аддз. і перавыбары бюро. Запраш. беспарт. студ. і навуковыя працаўнікі.

— Агульна-гарадзкі сход камсамольскага актыву гор. Менску а 16 кастрычніка **пераносіцца на 24 кастрычніка.** У пленуму ПК ЛКСМБ (дакл. тав. **Паляко ў**). Сход актыву адбудзецца ў пам. клюбу харчавікоў (рог Камсамольскай і Інтэрнацыянальнай вул.). Пачатак сходу а 7 гадз. увеч. Білеты па РК ЛКСМБ.

— Культпроп Фрунз. РК КП(б)Б паведамляе ўсе ячэйкі КП(б)Б, ЛКСМБ і слухачоў партыйнай школы, што заняткі ў першапачатковай партыйнай школе адбудуцца ў наступныя лічбы: 3, 5, 8, 13, 15, 18, 23, 25 і 28 кожнага месяца, а ў саўпартшколе—ў наступныя: 3, 5, 8, 9, 13, 15, 18, 19, 23, 25, 28 і 29 кожнага месяца. Бюро РК катэгарычна забараняе ў азначаныя дні склікаць якія-небудзь сходы, нарады і г. д. Зь ярмуі заняткаў адказнасьць будзе несьці бюро яч.

— Менская біржа працы прапануе ўсім прадпрыемствам і ўстановам гор. Менску тэрмінова даць весткі аб былых у рады Чырвонай арміі прызыву 1908 г., з паказаньнем займаных пасадаў.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

Культсэктар ЦСПСБ паведамляе ўсіх ЦП саюзаў, ФЗМК, культбрыгады, што 21 кастрычніка, а 7 г. увеч., адбудзецца

ШЫРОКАЯ НАРАДА ПА ПЫТАНЬНІ АБ ХОДЗЕ КУЛЬТАГЛЯДУ І ПЕРАКЛЮЧЭНЬНІ КУЛЬТАГЛЯДУ Ў КУЛЬТЭСТАФЭТУ,

на якую павінны зьявіцца культработнікі ЦП саюзаў, старшыні або культработнікі ФЗМК, культарганізатары цэхаў і культбрыгад.

Яўка абавязкова пад асабістую адказнасьць культсэктараў ЦП саюзаў.

Культсэктар ЦСПСБ.

Сёньня, 20 кастрычніка, а 7 г. увеч., у памяшк. ЦК МОПР'у (Савецкая, 87) адбудзецца

ПАШЫРАНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦК МОПР'у БССР

Яўка членаў прэзыдыуму ЦК МОПР'у абавязкова. Запрашаецца мопраўскі актыў.

ЦК МОПР'у БССР.

ЦП саюзу Саўгандальслужачых даводзіць да ведама ўсіх членаў саюзу СГС, што 20-га кастрычніка а 6 г. увеч., у памяшк. клюбу саўгандальслужачых будзе праходзіць **грамадзка-панаальны суд** над рахункавымі працаўнікамі «лятунамі» Саюзхлеба, пакінуўшымі працу ў часе хлебазагатоўчай кампаніі, і над адміністрацыяй Саюзхлеба, якая садзейнічала іх уходу. Склад суда: Максімчук—старшыня, Шапіра і Левін—члены суда. Грамадзкі абвінавайца т. Варабейчык—ЦП саюзу, грамадзкі абаронца т. Хейфец—МЦРК. Запрашаюцца ўвесь прафактыў і радавыя члены саюзу. Яўка старшынь МК і ГК і калектыву Саюзхлеба абавязкова.

Рэдакцыя і мясцком газэты „Зьвязда" з вялікім жалем паведамляюць аб трагічнай смерці старэйшага супрацоўніка рэдакцыі

НЭЙФАХА

ЛЬВА ЦЭЗАРАВІЧА

Пахаваньне адбудзецца 21 кастрычніка 1930 г. з першай савецкай больніцы (Ленінская, 54) а 5 гадз. увеч.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА"

Штодзенна дзенныя сэансы
Пачатак удзень а 1 гадз. і а 2 г. 30 м.
увечары а 7 гадз., » 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.

Ад панядзелка, 20 кастрычніка
НОВЫ АМЭРЫКАНСКІ ФІЛЬМ

БІЗУН НАГЛЯДЧЫКА

(Здарэньні на канадзкіх лесараспрацоўках).
Звыш праграмы: КІНО-ХРОНІКА САЮЗКІНО № 56,
ПАСЬЛЯ КОЖНАГА СЭАНСУ
ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ
Даніла ДЛЕНІН (Сьпевы сучаснасьці) | Кірыла ПЛАНСОН Віртуоз на балалайцы | А. Зарубіна і Л. Маладзяшын Арт. Ленінгр. балету
У раяля піяністы-кампазытар Б. ПРАЗАРОЎСКІ.
КАСА адкрыта ўдзень ад 12 гадз.
» » увечары ад 5 гадз.
Тыя, што спазьніліся па 15 мін., у залю не дапускаюцца.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Ад панядзелка, 20 кастрычніка
Замежны фільм
У ДОКАХ НЬЮ-ЁРКУ
(НОЧ НА ЗЯМЛІ)
Рэжысэр—ЖОЗЭФ ШТЭРНБЭРГ.
У галоўных ролях: Джорж Банкрафт, Бэта Компсон, О. Бакланава.
Штодня 4 сэансы. Пачатак 1-га сэансу а 6 г. увеч.
Каса адкрыта ад 4 г. 30 м.

Кіно „ЮКЫ ПІЯНЭР" З панядзелка, 20 кастрычніка
2-ая сэрыя **СТЭНЛЕЙ У НЕТРАХ АФРЫКІ** 2-ая сэрыя
(Адзін супроць многіх)
Пачатак 1-га сэансу а 12 г. дня, 2-га—1 г. 30 м., 3-га сэансу—3 гадз. дня.
Каса адкрыта ад 11 гадз. раніцы.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
З ПАНЯДЗЕЛКА, 20 КАСТРЫЧНІКА
Новы фільм вытворчасьці «Межрабпом фільм»—Масква «Прометэус»—Бэрлін.
Аўтар-рэжысэр В. Шнейдэраў
„ЭЛЬ-ІЕМЕН"
Сацыяльна-этнаграфічны нарыс у 6 частках.
Частка 1-я Ціхамэ. Частка 2-я У парту Хадэйдо. Частка 3-я У гарах Джэбеля. Частка 4-я Сана. Частка 5-я Горад Небаскробаў. Частка 6-я Эль-Іемен.
„Эль-Іемен" незалежная дзяржава Аравіі, амаль недаступная краіна для эўрапэйцаў. Ніколі яшчэ не пранікаў у гэты край аб'ектыў кіно-апарату. Аднак спэцыяльная экспэдыцыя „Межрабпом-фільм" СССР і „Прометэус" (Нямеччына) улетку 1929 г. упершыню засьняла адну з дзяржаў Аравіі—„Эль-Іемен".
Звыш праграмы хроніка Саюзкіно № 37.
Штодзенна 4 сэансы: Пачатак 1-га сэансу а 6 г., 2-га—7 г. 30 м., 3-га—9 г., 4-га—10 г. 30 м.
Каса адкрыта з 5 гадз.

Кіно „СПАРТАК" З панядзелка, 20 кастрычніка выдатны фільм **НАМУС** трагедыя ў 8 част. Пач. сэансаў: 7 г., 9 г., 10 г. 45 м. Каса—ад 6 гадз.

ПРАДАЮЦЦА з пад шкляныя балёны кіслаты. Зварачацца: Савецкая, 63., 2ог. гасп. выд—ва „ЗЬВЯЗДА"

ПРЫ СТАРА-БАРЫСАЎСКІМ СЬВІНАГАДОЎЧЫМ ТЭХНІКУМЕ
трэстам «Сьвіновод» арганізуюцца

6-месячныя курсы тэхнікаў-сьвіноводаў.

На курсы прымаюцца старэйшыя рабочыя сьвінагадоўчых саўгасаў, брыгадзіры жывёлаводчых калгасаў, асобы скончыўшыя с.-г. прафэхшколы, ШКМ, дэмабілізаваныя чырвонаармейцы, прайшоўшыя с.-г курсы ў Чырвонай арміі і асобы, скончыўшыя ня менш 5 груп 7-годкі, добра знаёмыя з сельскай гаспадаркай.

Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакументы: 1) Аб асьвеце. 2) Аб практычным стажы. 3) Водзывы партыйнай, камсамольскай ці прафсаюзнай арганізацыі. 4) Аб сацыяльным паходжаньні і ненадбаўленьні выбарчых правоў. 5) Даведка ад адміністрацыі з месца працы аб вошлсу на курсы.

У першую чаргу прымаюцца на курсы асобы, камандыраваныя камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі.

Прыём заяў вытвараецца **да 28 КАСТРЫЧНІКА, а** пачатак заняткаў з 1 лістапада.

Слухачы курсаў забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры 60 руб. і кватэрай без пасьцельных прылад.

Прынятым на курсы аплачваецца праезд з месца працы да курсаў і назад.

Скончыўшым курсы абавязоўцца прапрацаваць у саўгасах «Сьвіновод» ня менш аднаго году.

Заявы накіроўваць па адрасе: **г. БАРЫСАЎ, Стара-Барысаўскі сьвінагадоўчы тэхнікум.**

Дырэктар тэхнікуму ЖУКАЎ.

Абвяшчаецца набор слухачоў на курсы па падрыхтоўцы на факультэт наргасу БДУ.

На курсы прымаюцца рабочыя і чырвонаармейцы, якія адпавядаюць наступным запатрабаваньням: 1) Узрост ня менш 17 г. і ня звыш 35 г. 2) Рабочы стаж ня менш 2-х год. 3) Асьвета-ня ніжэй 7-годкі ці падобная да яе тыпу школы (асобы, што ня маюць паказаных асьветы, прымаюцца пасьля праходжаньня іспытаў у аб'ём праграмы 7-годкі).

Для чырвонармейцаў патрэбен дазвол ад штабу палка ці роты аб паступленьні на курсы.

Для паступленьня наабходна прадставіць наступныя дакументы: 1) анкету, заверапую фабзаўкомам, 2) даведку аб рабочым стажы, 3) даведку аб годзе паражэньня, 4) дакумант аб асьвеце, 5) даведку ад партыйнай, ці камсамольскай яч., ці прафсаюзнай арганізацыі аб грамадзкай працы, 6) даведку аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын).

Залічныя на курсы ўзвальняюцца ад 2-гадзіннай працы на вытворчасьці пры захаваньні за імі аплаты.

Курсы разьлічаны на 8 месяцаў.

Заявы на курсы прымаюцца да 1 лістапада ў прафкоме наргасу штодзенна ад 3 да 5 гадз. увеч. (гал. корп. Унівэрс. Гарадка).

Аб пачатку заняткаў курсаў будзе абвешчана асобна.

ЛЯЧЭБНІЦА МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў,
АДКРЫТА ад 9 г. ран. ад 9 г. увеч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
ЭЛЕКТРЯ-СЬВЕТЯ-ЛЯЧЭНЬНЕ і КВАРЦ адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
РЭНТГЕН (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 6 г. да 8 г. увеч.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзенна
КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПРАФЭСАРОЎ па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс с 9 г. раніцы да 9 г. увеч.
Прыём хворых па лекавых кніжках мясцкомітэту. Для усіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.

ЭЛЬВОД

паведамляе, што ў сувязі з рамонтам водаправоду на рогу вул. Карла Маркса і Ленінскай, **будзе СПЫНЕНА ПАДАЧА ВАДЫ 20-га кастрычніка з 22-х гадз. да 7-мі гадз. раніцы 21 кастрычніка**

ПА НАСТУПНЫХ КВАРТАЛАХ:

1. Па Ленінскай ад Савецкай да Унівэрсытэцкай.
2. Па вул. Карла Маркса ад Камсамольскай да Чырвонаармейскай.
3. Па вул. Энгельса ад Савецкай да Унівэрсытэцкай.

ЦУКАР
па цане: Пясок—2 р. 40 к. Рафінад—2 р. 50 к.
Прадаецца ў крамах МЦРК:

Крама 5—Школьная, 1
» 8—Нова-Маскоўская, 21
» 10—Нова-Мясьніцкая, 1
» 17—Ленінская, 19
» 38—пор Шырокай і Нова-Камароўкі
» 43—Сураскі рынак
» 78—Разінская, 19
» 94—Сьвярдлоўская, 25
» 112—Чэрвенскі тракт, 88
» 116—Фабрычная
» 129—Б.-Татарская
» 131—2-я Стара-Віленская
» 142—Ніжкі рынак, 47
Крама 145—Савецкая, 78
» 169—Савецкая, 61
» 175—Барысаўскі тракт
» 185—Ленінская, 16
» 192—Савецкая, 91
» 193—Савецкая, 37
» 202—Сьвярдлоўскі рынак
» 206—Койданаўскі рынак
» 211—Вул. Талстога, 31|2
» 3-а—Гандзёвая вул.
Ларок 3—Сьвярдлоўскі рынак
» 4—Пл. Парыскай Камуны
» 16—Ніжкі рынак

Згубленыя і украдзеныя дакументы

пічыць несапраўднымі

Пасьведч. на атрым. дапам. Філіповіча Ф. І., выд. Менакрсабезам, кв. 2475; даведка аб пераходзе ў 3 групу Дукорскага Д. Я., выд. Мен. 3 сав. школай, кв. 2476; пашп. Дзехцяровай П. К., выд. Мен. міліцыяй, кв. 2477; вуч.-конск. кн. Новікава Г. М., выд. Лагойск. РВК, кв. 2478; вайск. кн. Паўпінава Я. П., выд. 9 адд. пульэскадр., кв. 2479; каап. кн. № 1817 Бадзень Н. Е., выд. Заслаўскім спаж. т-вам, кв. 2480; чырвонаарм. кн. Раманава В. Я., выд. 2 арт. п., кв. 2481; дам. кн. л. № 6, Жакту № 8 па Падгорн. зав., выд. Мен. міліцыяй, кв. 2482; мэтр. вып. Цэхановіча В. У., выд. Мен. Загс'ам, кв. 2483; парт. біл. № 0815095 Філіпчука А. В., выд. Мен. АК КП(б)Б, кв. 2484; бірж. карт. Бэрман Д. М., выд. Мен. бірж. працы, кв. 2485; партбіл. № 1105992, выд. Мен. АК КП(б)Б, чл. біл. саюзу СГС № 13528, асаб. пасьведч., выд. кір. спраў СНК БССР на імя Куліцкай В. А., кв. 2486—2488; чл. біл. саюзу харчавікоў Блехара К. Л., кв. 2489; даведка, выд. к-рай ст, Менск-тав. МВБ ч. Нацюсок Ліцкай С. І., выд. Пацэйкаўскім с.-с., кв. 2491; чл. біл. саюзу МСП № 4568 Старобінец С. Л., кв. 2492; пасьведч. Шапіра Ф. С., выд. курс. па падрыхт. у БДУ, кв. 2493; пасьведч. Кротавай А. В., выд. курс. па падрыхт. у БДУ, кв. 2494; віза Адамчук Ю. Я., выд. борн. карт. ЦРК Адамчука Г. І., кв. 2496; дзіц. наб. кн. Сыпока В. Л., выд. МЦРК, кв. 2497; мэтр. вып. Тараскевіч Л. М., выд. Мен. ЗАГС'ам, кв. 2498; каап. кн. т-